Сямейная газета



**Калі хочаш змяніць свет да лепшага...**



**Ці любіла Ажэшка Гродна?**




**Хто ён, новы Караткевіч?**
СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛІСТАПАДА 2014 г. ЧАЦВЕР № 225 (27835) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр:**

***«Ва ўрадзе не задаволены работай шэрагу рэгіёнаў па аднаўленні аб'ёмаў вытворчасці свініны. Некаторыя нават не знайшлі часу спецыяльна разгледзець гэтае пытанне на пасяджэннях аблвыканкамаў, працуюць разавымі даручэннямі. Ну што ж, і такі стыль працы можа быць. Галоўнае — каб быў вынік. Нездавальняючай прызнана праца ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Работа па аднаўленні аб'ёмаў вытворчасці свініны ў краіне знаходзіцца на пастаянным кантролі ўрада, адпаведныя даручэнні былі дадзены кіраўніком дзяржавы. Урадам прыняты неабходныя рашэнні, і аб'ёмы вытворчасці свініны ў першым квартале 2015 года павінны скласці 124,3 тысячы тон. Неабходна выйсці на аб'ёмы першага квартала 2012 года. Вытворчасць свініны ў жывой вазе за студзень—кастрычнік 2014-га ў цэлым па краіне склала 322,8 тысячы тон, або 83,5% да адпаведнага перыяду 2013 года. На 1 студзеня 2016-га пагалоўе свіней у Беларусі павінна перавысіць 3,3 млн, валавая вытворчасць у жывой вазе складзе 485 тысяч тон».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.11.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10800,00 | ▲ |
| Еўра | 13470,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 233,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 715,23 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Свята не за гарамі



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

г. Мінск. Прывакзальная плошча.

■ Блізкая ўлада

## ТАК ВАЖНА ЗНАЙСЦІ КАМПРАМІС

**Прыкладна год таму ў прыватных гандляроў сельскагаспадарчай прадукцыяй Жлобінскага раёна з'явілася падстава для хвалявання. Мясцовыя ўлады папярэдзілі ўсіх, што хутка — у сувязі са зменай уласніка былога калгаснага рынку на вуліцы Вароўскага — знікне магчымасць гандляваць каля чыгуначнага вакзала.**

Марыя Трызна з пасёлка Лукскі Жлобінскага раёна на працягу многіх гадоў прадае сельскагаспадарчую прадукцыю са сваёй сядзібы ў горадзе металургаў. Жанчына — адна са шматлікіх аўтараў пісьма, дасланага на адрас Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, перш чым пісаць у высокую інстанцыю, людзі не раз пабывалі на прыёмах у першых асоб райвыканкама. Прыходзілі калектыўна з адной просьбай — даць ім магчымасць афіцыйна гандляваць калі не ў ранейшым месцы, дык у іншым, але ж зручным. І ўлады казалі: маўляў, не хвалюйцеся, усё будзе зроблена.

Цэлы год чыноўнікі «шукалі магчымасці». Начальнік аддзела гандлю і паслуг Жлобінскага райвыканкама Таццяна Карабан пацвярджае, што пытанне ставілася даўно:

— Рынак калісьці належыў Жлобінскаму райпа, потым яго прадалі прыватніку. Мы планавалі рэканструяваць вуліцу Вароўскага, каб можна было ажыццяўляць гандаль сельскагаспадарчай прадукцыяй — для гэтага прапанавалі ўсталяваць навесы. Але ж новы ўласнік прадставіў эскізнае рашэнне, згодна з якім на вуліцы зноў з'явіліся б ралеты. Выканкам не пагадзіўся.

СТАР. 4

# КАЛІ АДЛЕГЛАСЦЬ — НЕ ПЕРАШКОДА

## У супрацоўніцтва нашай краіны з В'етнамам — вялікія магчымасці і перспектывы

**В'етнам з'яўляецца для нас значным і правераным часам партнёрам у Паўднёва-Усходняй Азіі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з генеральным сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Нгуен Фу Чонгам, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў важнасць таго, што аўтарытэт В'етнама ў рэгіянальным і глабальным плане пастаянна расце. Краіны маюць падобныя погляды на актуальныя пытанні сусветнай палітыкі і канструктыўна супрацоўнічаюць у рамках міжнародных арганізацый.

«Мы бачым шмат нявыкарыстаных рэзерваў для далейшага ўмацавання нашага партнёрства. Гэта адносіцца перш за ўсё да гандлёва-эканамічнай сферы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. У беларускіх прадпрыемстваў ёсць вялікія магчымасці істотна нарасціць аб'ёмы паставак беларускай тэхнікі на в'етнамскі рынак, у першую чаргу сельгасмашын і аўтатэхнікі.

Значны імпульс развіццю адносін паміж Беларуссю і В'етнамам можа даць сумесная рэалізацыя буйных праектаў, лічыць Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў нас набыты значны досвед праектавання і будаўніцтва аб'ектаў рознай складанасці, развіцця інфраструктуры, мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі. На яго думку, ёсць добрыя напрацоўкі ў энергетыцы і іншых сферах. «Гэтым досведам мы гатовы падзяліцца з нашымі в'етнамскімі сябрамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён лічыць, што перспектыўным напрамкам беларуска-в'етнамскіх сувязяў з'яўляецца вытворчая кааперацыя.

У В'етнаме ўжо збіраюцца аўтамабілі МАЗ. З улікам абнаўлення парку пасажырскіх аўтобусаў, якое праводзіцца ў В'етнаме, Прэзідэнт Беларусі прапанаваў стварыць там сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці пасажырскай тэхнікі. У сваю чаргу Беларусь зацікаўлена ў больш актыўнай рабоце в'етнамскіх карпарацый на беларускім рынку.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што ў прадукцыі, выпрацаванай у рамках такіх праектаў, ёсць добрыя магчымасці для выхаду на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза.

В'етнам жа можа стаць плацдармам для пашырэння эканамічных інтарэсаў Беларусі ў рэгіёне Паўднёва-Усходняй Азіі, адзначыў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў важнасць развіцця эканамічных сувязяў з В'етнамам па ўсіх напрамках. Паводле яго слоў, у цяперашніх умовах Беларусь і В'етнам павінны развіваць супрацоўніцтва не толькі ў сферы адукацыі, але таксама ў галінах навукі і высокіх тэхналогій. На яго думку, ёсць перспектывы і па развіцці ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. Беларусь разлічвае на выпрацоўку сумесна з в'етнамскім кіраўніцтвам доўгатэрміновай стратэгіі ўзаемадзеяння ў гэтай сферы.

Беларускі лідар у 2015 годзе мае намер наведаць В'етнам. Ён прапанаваў пабудаваць сустрэчу такім чынам, каб «перагаворы сталі этапам падрыхтоўкі маштабных двухбаковых дамоўленасцяў у час маючага адбыцца візіту ў В'етнам».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што няма ніякіх рознагалоссяў паміж нашымі краінамі па міжнародным парадку дня, тут у краін падобныя пазіцыі. «Мы ўжо ўшчыльную падыходзім да якасна новага ўзроўню супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў. Будзем працягваць лінію на паступальнае паглыбленне двухбаковага ўзаемадзеяння паміж нашымі краінамі ва ўсіх галінах», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Беларусь падтрымлівае намеры В'етнама аб заключэнні Пагаднення аб свабодным гандлі з Мытным саюзам.

«Я лічу, што галоўным вынікам гэтага візіту стане рэалізацыя ўжо дасягнутых з нашымі дамоўленасцямі шэрагу мерапрыемстваў, якія дадуць магчымасць ажыццявіць прарыў у адносінах паміж Беларуссю і В'етнамам. І яны выйдуць на самы высокі ўзровень партнёрства і стратэгічнага супрацоўніцтва», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

■ Зробім разам!

**Андрэй ШОРАЦ:**

# «НЕ ПРАСІЦЕ ЗНІЖАК, А ЎНОСЬЦЕ ПРАПАНОВЫ!»

## Моладзь абмеркавала стратэгію развіцця беларускай сталіцы

**У рамках агульнарэспубліканскага праекта ГА «БРСМ» «Адкрыты дыялог «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня» прайшла завяршаючая сустрэча актыву са старшынёй Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэем ШОРЦАМ. Удзельнікі мерапрыемства — навучэнцы школ і гімназій, студэнты ВНУ, супрацоўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, члены Маладзёжнай палаты пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў — задалі мэру хвалюючыя іх пытанні.**


Фота БЕЛТА.

### НАВУЧЫЦЬ АДКАЗНАСЦІ ЗА СВАЕ ДВАРЫ

Ці магчыма зрабіць іх больш утульнымі? Старшыня Мінгарвыканкама заўважыў, што ў гэтым пытанні вельмі важная матывацыя грамадзян. «Неабходна трымаць баланс сродкаў, бо мінімальнае абсталяванне для двара можа даць дзяржава, а калі грамадзяне хочуць большага, ім трэба ўкладваць уласныя фінансы, — адзначыў Андрэй Шорац. — Гэта навучыць людзей па-іншаму ставіцца да двара, берагчы маёмасць. У нас ёсць пазітыўны прыклад: суботнікі носяць ужо народны, а не прымусовы характар» .

На думку мэра, трэба шмат папрацаваць і ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі. «Неабходна пазбаўляцца ад стэрэатыпу, што супрацоўнік ЖКГ — персанаж з вядомай савецкай кінастужкі «Афоня», — падкрэсліў старшыня Мінгарвыканкама. — Цяпер востра адчуваецца недахоп добрых кадраў у гэтай сферы. Хаўс-майстры (спецыялісты, якія працуюць комплексна як электрыкі, сантэхнікі, цесляры. — **Аўт.**) павінны быць замацаваны за канкрэтнымі дамамі. Тады ў іх з'явіцца ўсведамленне, што лепш зрабіць сваю працу якасна — раз і назаўсёды, а не спіхваць недаробленае на калег. Такое рашэнне прывядзе да большай адказнасці работнікаў».

### МЕСЦАМ ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ — БЫЦЬ

Сталічнай моладзі не хапае цікавых пляцовак кшталту пешаходнай вуліцы Карла Маркса, дзе летам ладзіліся канцэрты і выступленні. «У кожнага горада павінна быць «разынка», і калі людзі ўспрымаюць гэтыя праекты, чаму б іх не аднавіць?» — пракаментаваў Андрэй Шорац. Ён выказаў спадзяванне, што вуліцу Карла Маркса зробяць пешаходнай, а ў дадатак у Мінску з'явіцца яшчэ адна такая, якая стане цэнтрам адпачынку для мінчан.

Дыскусію выклікалі пытанні аб прадастаўленні спецыяльных месцаў для аматараў графіці і пляцовак для скейтараў. Мэр з прыхільнасцю падтрымаў ініцыятыву, але з адной умовай: «Нам важны ўдзел самой моладзі. Горад можа прафінансаваць гэтыя праекты, але знайсці месцы, даглядаць іх павінны вы».

Студэнты пацікавіліся, як выкарыстоўваюцца сталічныя гасцініцы, пабудаваныя да чэмпіянату свету па хакеі, ці не пустуюць яны? «Сёння ў Мінску налічваецца 18 гасцініц, і ўсе яны запоўнены напалову, — адзначыў Андрэй Шорац. — У гэтым бізнесе бралі ўдзел інвестары, якія не будавалі б гасцініцы, калі б не бачылі ўласнай выгады». Спікер неаднаразова адзначаў, што Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт адкрыты да супрацоўніцтва з прыватным бізнесам.

### ПАДТРЫМКА БУДЗЕ ПАД КАНКРЭТНЫЯ СПРАВЫ

Даволі шмат пытанняў падчас «Адкрытага дыялогу» было прысвечана зніжкам і льготам для студэнтаў. Многія з іх скардзяцца, што амаль палову стыпендыі аддаюць на месячны праязны на тры віды транспарту. Іншым не хапае грошай на кнігі. А камусьці хочацца плаціць менш за наведванне спартыўных аб'ектаў — басейна альбо Лядовага палаца. На гэтыя заявы Андрэй Шорац выказаўся вельмі канкрэтна: «Я не прыхільнік зніжак ды льгот. Дзяржава павінна даць чалавеку магчымасць зарабіць на тое, што яму патрэбна. Калі мы зрабілі бясплатны праезд для мінскіх студэнтаў, гэта выклікала негатыўную рэакцыю ў іншых абласных гарадах».

Тым не менш суразмоўца паабяцаў разгледзець некаторыя прапановы па прадастаўленні зніжак студэнтам. Ён адзначыў і новы кірунак у гэтым плане — ільготы для лячэння бясплодных сем'яў.

Студэнты прапанавалі сваю дапамогу пры будаўніцтве трэцяй лініі метро і выказаліся за стварэнне маладзёжнага цэнтра для сустрэч. У сваю чаргу, выступоўца падкрэсліў, што ён адкрыты да дыялогу і будзе супрацоўнічаць з моладдзю па розных пытаннях. «Зразумелае, кадры вырашаюць усё, — падсумаваў сустрэчу Андрэй Шорац. — Чакаю вашых канкрэтных прапаноў, за дзяржавай будзе фінансаванне».

Падобныя сустрэчы плануецца праводзіць пастаянна, што дазволіць кіраўніцтву горада эфектыўна ўзаемадзейнічаць з моладдзю. Практыка добрая, улічваючы, што наперадзе — Год моладзі.

**Кацярына РАДЗЮК** ■

■ Камунальныя стасункі

# ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ ЖЫЛЛЯ: ІХ МОЖНА ВЫРАШЫЦЬ

**Мінжылкамгас сцвярджае, што прынцып прыватызацыі — вяртанне дзяржаве затрачаных на будаўніцтва жылля грошай, а не атрыманне прыбытку.**

Пра гэта, у прыватнасці, паведаміў **кансультант упраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса Канстанцін КУЛІКОЎ.**

Паводле яго слоў, для многіх грамадзян балючым пытаннем з'яўляецца ўзровень цэн, які сёння выкарыстоўваецца для прыватызацыі, але ён дзейнічае ўжо больш за 14 гадоў. «Да гэтага ў грамадзян было 7 гадоў, каб рэалізаваць сваё права на прыватызацыю жылля ў цэнах на момант уводу дома ў эксплуатацыю. А з 1999 года прыватызацыя стала ажыццяўляцца ў цэнах на момант звяртання грамадзян з заявай», — адзначыў Канстанцін Кулікоў. Гэта сведчыць аб тым, што асноўны прынцып прыватызацыі — не атрыманне прыбытку, а вяртанне грашовых сродкаў, якія дзяржава затраціла на будаўніцтва жылога дома за вылікам кошту зносу і з улікам спажывецкіх якасцяў кватэры і якасці жылога асяроддзя, пераклаздзеных індэксным метадам у цэны на момант звяртання грамадзян з заявай.

У краіне, па статыстыцы на 1 студзеня гэтага года, маецца 4 млн 94 тыс. 631 кватэра, і тых, якія падлягаюць прыватызацыі, засталося менш за 360 тыс., або 8,8% ад агульнай колькасці кватэр, якія заселены па дагаворы найму жылога памяшкання і могуць быць прыватызаваны. Такім чынам, асноўная колькасць грамадзян краіны ўжо рэалізавалі сваё права на прыватызацыю жылля.

Дарэчы, трэба нагадаць, што ўступіў у сілу Указ №524 «Аб прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду». «Гэты дакумент не змяняе ўмовы і парадак прыватызацыі, вызначаныя раней Жыллёвым кодэксам Беларусі. Проста ўказ дазваляе вырашаць праблемныя пытанні прыватызацыі, якія выявіліся ў працэсе рэалізацыі грамадзянамі права на прыватызацыю жылых памяшканняў на завяршальным этапе ў сувязі з некаторымі зменамі заканадаўства за апошні час», — адзначыў Канстанцін Кулікоў.

**Намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Вячаслаў АБРАМАЎ** у сваю чаргу падкрэсліў, што Указ №524 накіраваны на вырашэнне складаных пытанняў, якія ўзнікалі ў практыцы прымянення заканадаўства аб прыватызацыі дзяржжылфонду. «Мы спадзяёмся, што дакумент дазволіць на завяршальным этапе правесці гэтую работу правільна і выключыць абгрунтаваныя скаргі і звароты грамадзян у органы дзяржкіравання па пытаннях, звязаных з вызначэннем кошту жылых памяшканняў», — адзначыў ён.

Указ таксама замацаваў практыку прыватызацыі жылых памяшканняў без неабходнасці дзяржаўнай рэгістрацыі такіх памяшканняў у Адзіным дзяржаўным рэгістры нерухомай маёмасці, правоў на яго і здзелак з ім, дакументам вызначаны адказныя органы дзяржкіравання па разглядзе зваротаў у сувязі з вызначэннем кошту жылых памяшканняў для прыватызацыі. Акрамя таго, дакументам урэгулявана пытанне аб прыватызацыі жылых памяшканняў, пабудаваных за кошт сродкаў арганізацый з частковым прыцягненнем сродкаў работнікаў.

**Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

**28 лістапада 2014 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.**

■ Прырода і мы

# ПЕСТЫЦЫДАМ У ЗЯМЛІ НЕ МЕСЦА

## Што рабіць з ядахімікатамі: вывозіць за мяжу ці спальваць? Кожны варыянт патрабуе вывучэння

**Як вырашыць праблемы ў галіне абыходжання з непрыдатнымі пестыцыдамі? На гэта пытанне спрабавалі сумесна знайсці адказ эколагі, прадстаўнікі Мінсельгасхарча, МНС і Мінздароўя падчас калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Сёння ў нашай краіне захоўваецца каля 10623,215 тон непрыдатных пестыцыдаў, з якіх 27% ад агульнай колькасці — на тэрыторыі сельгаспрадпрыемстваў, 30% — на КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці», і 43% — у падземных пахаваннях. Апошнія выклікаюць найбольшую трывогу эколагаў.

Каб засцерагчы прыроду і людзей ад пестыцыдаў, зацікаўленыя ведамствы прыступілі да ліквідацыі падземных пахаванняў. Ад непрыдатных пестыцыдаў ачышчаны тэрыторыі двух пахаванняў (Брэсцкага і Слонімскага) з сямі існуючых. Частка небяспечных рэчываў была вывезена ў Германію для абясшкоджвання, а частка размешчана на гомельскім комплексе.

Не менш увагі патрабуюць і непрыдатныя пестыцыды, якія захоўваюцца на тэрыторыі сельскагаспадарчых арганізацый. **Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ігар КАЧАНОЎСКІ** адзначыў, што тэрмін іх перапакавання сканчаецца, а гэта можа прывесці да забруджвання навакольнага асяроддзя. Існуюць праблемы і з несанкцыянаваным доступам людзей у гэтыя сховішчы.

Як жа пазбавіцца ад непрыдатных пестыцыдаў? У Мінпрыродзе вылучаюць некалькі шляхоў для вырашэння гэтай праблемы: вывезці іх для знішчэння ў Еўропу, рэканструяваць адзін з цэментных заводаў краіны для спальвання там небяспечных рэчываў ці стварыць мабільную ўстаноўку, якая дапаможа распраўляцца з ядахімікатамі на месцы. Усе гэтыя ідэі патрабуюць усебаковага разгляду і значных фінансавых выдаткаў. Магчыма, удзел Беларусі ў некалькіх міжнародных праектах, выдаткоўванне сродкаў з бюджэту дапамогуць вырашыць гэтую актуальную экалагічную праблему.

**Вераніка КОЛАСАВА** ■

# АЎТО З-ЗА МЯЖЫ З СУМНІЎНАЙ ГІСТОРЫЯЙ

## «Празрыстасць» беларуска-расійскай мяжы нярэдка дазваляе злачынцам пераганяць і збываць крадзены транспарт



**Як паведамілі «Звяздзе» ў Галоўным упраўленні крымінальнага вышуку МУС, сярод беларусаў у апошні час павялічыўся попыт на аўтамабілі, якія раней належалі грамадзянам Расіі. У 2013 годзе за адпаведны перыяд часу ў нашу краіну для асабістых патрэб перагналі звыш 25 тысяч аўтамабіляў. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў і Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз вызначылі, што ў 119 аўтамабілях быў зменены ідэнтыфікацыйны нумар, а 95 аўто ўвезлі з падробленымі ўліkова-рэгістрацыйнымі дакументамі. У выніку праверак аказалася, што 52 машыны шукаюць праваахоўныя органы Расійскай Федэрацыі.**

Нашы суайчыннікі найчасцей трапляюць у падобныя канфузы па нядбайнасці, з-за невыканання элементарных патрабаванняў заканадаўства пры падпісанні пагаднення куплі-продажу аўтамабіля. Нярэдка ў афармленні дагавора пакупнік не ўдзельнічае. «Прадавец» прапануе пакінуць свае анкетныя даныя (альбо копію пашпарта), а праз пэўны час перадае аформлены без удзелу пакупніка дагавор куплі-продажу і дакументы на аўтамабіль. І толькі пры перадачы машыны з яе «пашпартам» у рэгістрацыйныя падраздзяленні ДАІ высвятляецца, што дакументы падрабілі, ідэнтыфікацыйны нумар змянілі, а транспартны сродак знаходзіцца ў вышуку.

Каб знізіць падобную рызыку, МУС настойліва раіць пры набыцці аўто на тэрыторыі Расіі ўладальнікам і пакупнікам удзельнічаць у складанні неабходных дакументаў у Дзяржаўнай інспекцыі бяспекі дарожнага руху Расіі.

**Якаў ЖУРБІН.**

# КОЛЬКАСЦЬ ЦІ ЯКАСЦЬ?

■ Абітурыент-2015

## Мінімальныя балы на ЦТ зменшаць не плануецца, а апошні дзень падачы дакументаў можа стаць «днём цішыні»

**«Вышэйшая адукацыя не павінна ператварацца ў прахадны двор, а розныя прывілеі маладыя людзі павінны атрымліваць ужо пасля свайго паступлення», — такую думку на калегіі Міністэрства адукацыі, прысвечанай падвядзенню вынікаў прыёмнай кампаніі, агучыў віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як вядома, сёлета для абітурыентаў, якія паступалі ў рамках дадатковага набору, планка на ЦТ была знiжана на 5 балаў па кожным прадмеце. А для асоб, якія паступалі на ваенныя, сельскагаспадарчыя і спартыўныя спецыяльнасці, мінімальнае значэнне складала ўвогуле 3 балы па ўсіх экзаменацыйных дысцыплінах ЦТ.

— Вызначэнне парогавых балаў для першай хвалі залічэння ўхвалілі як ва ўніверсітэцкім асяроддзі, так і сярод грамадзян — паколькі існаванне пэўнай планкі на ўваходзе ў ВНУ адпавядае разуменню пра элітарнасць вышэйшай адукацыі, — падкрэсліў у сваім выступленні на калегіі **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ**. — Адыход ад гэтага прынцыпу пры дадатковым наборы меў на мэце выканаць кантрольныя лічбы прыёму на востраадэфіцытных для эканомікі спецыяльнасцях, якія не карыстаюцца асаблівай папулярнасцю ў абітурыентаў. І гэтую задачу парогавыя значэнні паспяхова вырашылі. Аднак рэзка негатыўную ацэнку з боку грамадскасці атрымала парогавае значэнне ў 3 балы, пралабіраванае адпаведнымі органамі дзяржаўнага кіравання. Міністэрства адукацыі лічыць, што зніжэнне парогавага ўзроўню ва ўмовах нізкага конкурсу не дазваляе адабраць лепшых абітурыентаў для атрымання вышэйшай адукацыі і ў доўгатэрміновай перспектыве прывядзе да зніжэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, што выпускаюцца. Мяркуем, што выкананне кантрольных лічбаў прыёму павінна дасягацца не за кошт зніжэння парога, а дзякуючы ўзмацненню прафарыентацыйнай работы.

У 2015 годзе Міністэрства абароны прапануе ўстанавіць парогавае значэнне на ўзроўні 5 балаў па ўсіх дысцыплінах у асноўны набор. Але ў Міністэрстве адукацыі, якое нясе адказнасць за якасць падрыхтоўкі спецыялістаў па ўсёй краіне, з такім падыходам нязгодныя. Тут лічаць, што ўсім трэба прытрымлівацца адзінага парога, вызначанага для ўсіх профіляў адукацыі. Разам з тым у галоўным адукацыйным ведамстве дапускаюць, што пры ажыццяўленні мэтавага набору на вайсковыя і сельскагаспадарчыя спецыяльнасці адпаведнаму органу дзяржкіравання можна даць права вызначаць самастойна парогавыя значэнні вынікаў ЦТ.

Міністэрства адукацыі прапануе захаваць на наступны год парогавыя балы, вызначаныя для асноўнага і дадатковага набору ў 2014 годзе. Але да ўдзелу ў дадатковым наборы дапускаць тых абітурыентаў, якія не пераадолелі парог тэставага бала для асноўнага набору толькі па адным прадмеце. Сёлета пры дадатковым наборы было залічана каля 200 чалавек, якія не пераадолелі вызначаны на ЦТ парог адначасова па двух прадметах, а 12 чалавек правалілі іспыты па ўсіх трох дысцыплінах.

**Для першай профільнай дысцыпліны мінімальны парог можа быць павышаны на 5 балаў — да 20 балаў.**

— Гэта ж трэба было ўмудрыцца, каб набраць на трох прадметах 9 балаў з 300 магчымых! І якіх спецыялістаў мы можам атрымаць з абітурыентаў з такімі ведамі? — задаў рытарычнае пытанне Анатоль Тозік. — Я ўпэўнены, што і мову будучым спецыялістам з вышэйшай адукацыяй таксама трэба ведаць, каб хоць у заяве не дапускаць граматычных і арфаграфічных памылак.

Менавіта нізкія вынікі на ЦТ па беларускай ці рускай мове нярэдка становяцца перашкодай для абітурыентаў, якія паступаюць на інжынерна-тэхнічныя і вайсковыя спецыяльнасці. Таму некаторыя кіраўнікі ВНУ і спрабуюць сябе «падстрахаваць», лабіруючы зніжэнне важнасці адзнакі па гэтай дысцыпліне. Напрыклад, прапануюць прызначаць мінімальны парог не па кожнай дысцыпліне, а ўвесці нейкую суму балаў па ўсіх трох дысцыплінах ЦТ, ніжэй за якую абітурыенту, каб быць дапушчаным да конкурсу, нельга будзе набіраць.

Міністэрства адукацыі, у сваю чаргу, прапанавала падкрэсліць важнасць першай профільнай дысцыпліны (на кожнай спецыяльнасці абітурыенты здаюць дзве профільныя дысцыпліны плюс ЦТ па дзяржаўнай мове). Для першай профільнай дысцыпліны мінімальны парог можа быць павышаны на 5 балаў — да 20 балаў. Скажам, калі абітурыент паступае на хімфак, то ён павінен мець не менш як 20 балаў на ЦТ па хіміі.

Яшчэ адна прапанова Міністэрства адукацыі тычыцца змянення парадку інфармавання абітурыентаў аб ходзе падачы дакументаў. Фактычна такое інфармаванне зводзіць усю прафарыентацыйную работу ўстаноў адукацыі і заказчыкаў кадраў да нуля. Калі пасля вывучэння інфармацыйных табліц аб ходзе падачы дакументаў абітурыент выбірае спецыяльнасць, дзе яго шанцы на паступленне найбольш верагодныя, такі выбар можна назваць кан'юнктурным.

Да таго ж інфармаванне стварае праблему апошняга дня, калі па многіх спецыяльнасцях падача дакументаў пачынаецца фактычна пасля 15 гадзін, гэта значыць, пасля апошняга абнаўлення інфармацыі.

— Апошні дзень падачы дакументаў павінен быць «днём цішыні», — дадаў Вадзім Богуш, — каб у абітурыентаў была магчымасць у спакойных абставінах абдумаць свае памкненні і жаданні. Таксама трэба вярнуцца да ранейшага спосабу інфармавання, гэта значыць, даваць інфармацыю аб колькасці пададзеных заяў на канкрэтную спецыяльнасць без залішняй дэталізацыі. Дадаткова можна даваць інфармацыю пра мінімальную і максімальную суму балаў абітурыентаў, якія ўжо падалі свае заявы ў прыёмную камісію.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ Футбол ЛЧ

## «ДРАКОНЫ» НЕ СПУЖАЛІСЯ МАРОЗУ

**На апошнюю хатнюю гульню групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў трэнерскі штаб барысаўскага клуба ставіў шмат адказных задач. Па-першае, не паўтарыць разгрому першага матча з партугальцамі. Па-другое, парадаваць сваіх балельшчыкаў. Тым больш што ў той марозны вечар на трыбунах «Барысаў-Арэны» сабраліся больш за 10 тысяч аматараў футбола!**

І, трэба сказаць, у першым тайме падапечныя Аляксандра Ермаковіча гэтыя задачы выканалі. Барысаўчане не проста адбіваліся ад атак «пірэнейцаў», а самі імкнуліся атакаваць вароты Фабіяна. Зусім крыху не хапіла далёкаму прастрэлу Карніцкага і «стандарту» з завяршальным ударам Валадзько... Тым не менш нулі на табло пасля заканчэння першых 45 хвілін паядынку настройвалі на пазітыў. Але, на жаль, не выйшла. Спачатку Эрэра адкрыў лік, і ён жа дапамог Тэлья паставіць кропку ў матчы, а між імі вызначыўся Марцінес — 0:3.

Такім чынам, БАТЭ ўстанавіў антырэкорд па колькасці прапушчаных галоў у Лізе чэмпіёнаў. Сёлета вароты «жоўта-сініх» паражалі ўжо 22 разы. Для параўнання, на другім месцы ў гэтай намінацыі ідзе турэцкі «Галатасарай» з лічбай «13». Амаль што бездань...

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■

■ Па той бок прылаўка

# ПРАВЕРКІ І ГАНДЛЯРОЎ «ТОЧАЦЬ»

**Міністэрствы гандлю і аховы здароўя, Дзяржстандарт працягваюць інспектаваць рынкі краіны. Нядаўна былі правераны яшчэ 15 з іх.**

Гандлёвай інспекцыяй Мінгандлю, інспекцыямі Дзяржстандарта, санітарнымі органамі Міністэрства



Фота БЕЛТА.

аховы здароўя суб'ектам гаспадарання па выніках кантрольных мерапрыемстваў было выдадзена звыш 130 рэкамендацый аб выпраўленні выяўленых парушэнняў, у тым ліку чатыры — непасрэдна адміністрацыям рынкаў, інфармуе прэс-служба Міністэрства гандлю. Маніторынг больш за 330 суб'ектаў гаспадарання паказаў, што незахаванне парадку маркіроўкі тавараў, адсутнасць дакументаў, што пацвярджалі б іх якасць, па-ранейшаму маюць месца быць. Напрыклад, былі выяўлены выпадкі рэалізацыі парфумерна-касметычнай прадукцыі са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Разам з тым, адзначаюць спецыялісты міністэрства, у тым ліку дзякуючы і растлумачальнай рабоце ўдалося дабіцца зніжэння колькасці такіх парушэнняў у параўнанні з вынікамі маніторынгу, праведзенага ў жніўні-верасні гэтага года.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Ну і ну!

## УНУК ПАДПАЛІЎ КВАТЭРУ БАБУЛІ

**Бліжэй да поўначы сталічным выратавальнікам давялося выязджаць па выкліку на пажар, што здарыўся ў кватэры пяціпавярховага жылога дома па вуліцы Карпава.**

Двухпакаёўка належыць пенсіянерцы 1949 года нараджэння, якая пражывае разам з 40-гадовай дачкой. Абедзве жанчыны сустрэлі работнікаў МНС на вуліцы. А вось меркаванага віноўніка здарэння — 18-гадовага непрацуючага ўнука, што таксама жыве ў гэтай жа кватэры, — пажарныя знайшлі на лесвічнай пляцоўцы. Ён быў шпіталізаваны з атручэннем прадуктамі гарэння. У жыллі — на балконе і ў адным з жылых пакояў — пажарныя выявілі два ачагі загарання. Мяркуецца, што прычынай здарэння быў падпал, учынены ўнукам гаспадыні. Малады чалавек быў нападпітку.

## ...А ПАКІНУТЫ БЕЗ НАГЛЯДУ СЫН ВЫКЛІКАЎ... МНС

**У вёсцы Мурава Пружанскага раёна чатырохгадовы хлопчык паведаміў пра неіснуючы пажар.**

Паводле інфармацыі Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС, увечары яго маці пайшла ў краму. Праз нейкі час дзіцяці, відавочна, стала сумна. Хлопчык набраў «101» і сказаў, што ў доме... гарыць дыван, а побач нікога няма. З адрасам ён памыліўся, тым не менш на выратаванне дзіцяці прымчаліся тры экіпажы падраздзялення выратавальнікаў. Віноўнік-жартаўнік патлумачыў, што прыгадаў, як было весела ў дзіцячым садзе, калі туды прыязджалі пажарныя і расказвалі аб правілах пажарнай бяспекі...

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Медыцынская дапамога

# ДАВАЙЦЕ БЕЗ САМАЛЯЧЭННЯ!

**Вось ужо больш за месяц мы жывём ва ўмовах узмоцненага кантролю за рацыянальным прызначэннем лекавых сродкаў — у аптэках укаранілі новую практыку іх рэалізацыі. У Міністэрстве аховы здароўя паведамляюць аб тым, што змяненне сітуацыі выклікала пэўнае непаразуменне з боку, хіба, мінчан, якія з першага дня, не разабраўшыся, што да чаго, пачалі скардзіцца і абурацца.**



У рэгіёнах жа няма такой рэакцыі — чэргаў у медустановах па рэцэпты не назіраецца. Разам з тым, спецыялісты зноў падкрэсліваюць неабходнасць і важнасць падобных мер, паколькі, паводле прыблізных даных, штогод каля 3 мільёнаў людзей у розных краінах атрымліваюць ускладненні ад бескантрольнага прыёму лекаў. Сусветная арганізацыя аховы здароўя занепакоена тым, што самалячэнне прывяло да множнай лекавай устойлівасці да туберкулёзу, выклікала ўстойлівасць да антыбіётыкаў, справакавала рост алергічных захворванняў (у першую чаргу ў дзяцей), дысбактэрыёзаў, гарманальных парушэнняў.

Некаторыя тлумачэнні таго, што і як змянілася, дае **начальнік аддзела медыка-санітарнай дапамогі Камітэта аховы здароўя Мінгарвыканкама Людміла ЛУГАВЕЦ:**

**— Без рэцэпта сёння па-ранейшаму можна набыць шмат неабходных сродкаў для самадапамогі.** Гэта лекавыя сродкі, прызначаныя для экстраннага зняцця высокага крывянога ціску, лекі, якія прымяняюцца пры павышэнні тэмпературы і першых прыкметах вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, сродкі для лячэння кішэчных расстройстваў, супрацьмікробныя прэпараты і многае іншае.

**Лекі, якія павінны адпускацца па рэцэпце ўрача, павінны адпускацца менавіта такім чынам.** Гэта сусветная практыка, якая знайшла адлюстраванне ў нядаўняй пастанове міністэрства. Актуальнасць дакумента — бясспрэчная. Нашы грамадзяне любяць пашумець нанконт ігнаравання інтарэсаў хворага, якому, маўляў, не варта лішні раз звяртацца ў паліклініку. Аднак мы добра вывучылі праблему і бачым, што ніякага клопату аб хворым у самалячэнні, набыцці лекаў без рэцэпта няма. Больш за тое, у гэтым ёсць шмат дрэннага. Я магу прывесці не адзін выпадак, калі нашы людзі не проста атрымлівалі пабочны эфект ад няправільнага выкарыстання лекавых сродкаў, але станавіліся інвалідамі — страчвалі зрок, слых і г.д.

**Лекавыя сродкі могуць выпісвацца тэрмінам да шасці месяцаў.** Пры гэтым урач можа выпісваць некалькі рэцэптурных бланкаў на гэты час. Вось тут якраз улічваюцца сапраўдныя інтарэсы хворага. Можа быць, пацыенту зручней плаціць часткамі, набываць не цэлую ўпакоўку адразу на ўвесь курс, а, скажам, адзін блістар (10 таблетак, 12 таблетак і г.д.). Такая практыка дзейнічае ўжо другі год у дачыненні да выпіскі рэцэптаў хранічным хворым. Цяпер такі падыход распаўсюджваецца на ўсю практыку выпіскі рэцэптаў.

**У сельскай мясцовасці рознічны продаж лекаў ажыццяўляюць медработнікі ФАПаў, урачэбных амбулаторый, бальніц сястрынскага догляду, участковых бальніц.** Практыкуецца і сумесны выезд урачэбных брыгад і аптэк. Так што нельга гаварыць аб тым, што за межамі буйных гарадоў будуць узнікаць праблемы з даступнасцю да лячэння.

**Калі ў аптэцы няма таго сродку, які пазначаны ў рэцэпце, фармработнік мае права замяніць яго на іншую гандлёвую назву, калі толькі гэты лекавы сродак або псіхатропнае рэчыва не было выпісана бясплатна ці на льготных умовах.** Калі ж грамадзянін не згодны на такую замену, фармацэўтычны работнік павінен узяць рэцэпт, зафіксаваць яго ў журнале рэгістрацыі рэцэптаў, якія знаходзяцца на адтэрмінаваным абслугоўванні, і арганізаваць забеспячэнне лекамі ў бліжэйшыя пяць дзён.

### Дарэчы

• *Як і раней, за поўны кошт урач можа выпісваць пацыенту лекавыя сродкі айчыннай і замежнай вытворчасці з выкарыстаннем яго міжнароднага непатэнтаванага наймення або з указаннем канкрэтнай гандлёвай назвы.*

• Рэцэпты на наркатычныя сродкі павінны захоўвацца 5 гадоў, а рэцэпты, рэалізаваныя з аптэк за поўны кошт (за выключэннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, этылавага спірту і лекаў, на якія ўстаноўлены нормы адначасовай рэалізацыі), таксама застаюцца ў аптэцы, захоўваюцца на працягу месяца і пасля знішчаюцца ва ўстаноўленым парадку.

• *Лекі выпісваюцца з улікам не толькі дыягназу, узросту і г.д., але і з улікам даступнасці па кошце. Гэта азначае, што ў першую чаргу выпісваюцца лекавыя сродкі айчыннай і замежнай вытворчасці, набытыя па выніках дзяржаўных закупак.*

• Дазваляецца выпісваць рэцэпты ўрача з выкарыстаннем не толькі лацінскай, але і беларускай і рускай моў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### БОЛЬШ ЗА ТРЫ ГАДЗІНЫ — НА РЭЦЭПТ?

Далёка не ва ўсіх паліклініках той жа сталіцы ўдаецца наладзіць работу належным чынам. Пацыенты скардзяцца на доўгія чэргі, адсутнасць спецыялістаў. З аднаго боку, такія цяжкасці абумоўлены аб'ектыўнымі прычынамі. Укамплектаванасць тэрапеўтамі па горадзе знаходзіцца зараз на ўзроўні 70 працэнтаў, а па шэрагу вузкіх спецыяльнасцяў — і таго менш. З другога боку, адміністрацыя можа вырашаць падобныя пытанні, прадухіляць скаргі, не дадаваць пацыентам галаўнога болю.

**Вось адно з тыповых нараканняў ад мінчанкі Веры Васільеўны:**

— У маёй паліклініцы ўчастковага няма, аднак для выпіскі рэцэптаў павінны працаваць два чалавекі. Падыходжу да таго кабінета, у які мяне накіравала рэгістратура. Пад дзвярыма — чалавек восем. Дзверы кабінета зачынены. Усе сядзяць, чакаюць. Гадзіны праз дзве даведваемся, што трэба спусціцца ў кабінет паверхамі ніжэй, дзе ўрачоў падменяць дзве медсястры. Тут зноў давялося пачакаць… Урэшце трапіла да медсястры, якая выпісала рэцэпты адразу на тры месяцы. Па вялікім рахунку, я магу пакінуць у аптэцы амаль 400 тысяч за раз, але ж не ўсе такія. Між тым медсястра і не прапаноўвала выпісаць некалькі рэцэптаў, хоць павінна разумець, што патрэбны мне прэпарат не можа быць танным…

# ТАК ВАЖНА ЗНАЙСЦІ КАМПРАМІС

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Пры гэтым трэба і ўласніка зразумець: ну хто, скажыце, будзе ўкладаць грошы пад дробны гандаль сельгаспрадукцыяй? Увесь час, пакуль абмяркоўвалася праблема, гандляры былі гатовы прадаваць сваю прадукцыю «з зямлі». Год яны так і рабілі, не плацілушы грошы ні за што. Да таго ж, і ў санітарных службаў было шмат нараканняў. Аднак наводзіць парадак трэба было, і ўрэшце мы прапанавалі ім пакінуць вуліцу Вароўскага і перамясціцца на рынак «Сонечны», дзе дастаткова месцаў для гандлю і дзе ёсць навесы. Але яны туды не ідуць.

Цяпер улады Жлобіна прапанавалі дзве пляцоўкі для гандлю. Першая — рынак Сонечны. Ад вакзала да спальнага мікраёна № 16, дзе ён знаходзіцца, прыкладна 10 хвілін язды на грамадскім транспарце. Гандлярам са сваёй прадукцыяй туды дабірацца не вельмі зручна. Да таго ж з раніцы там нічога не прадасі — бо ўсе, хто жыве побач, — на працы, а вечарам гандлярам самім дадому, у навакольныя вёскі, неяк трэба даехаць.

Другая пляцоўка, якую прапанавалі ўлады для гандляроў сельгаспрадукцыяй, — каля крамы «Суседзі». Ёю скарысталіся тыя, хто мае свой транспарт, бо там можна гандляваць непасрэдна з машын. Але ж спецыяльна прыстасаваных для гэтай мэты прылаўкаў, а таксама грамадскай прыбіральні побач няма.

Трэба сказаць, што на працягу года на ўсё той жа прывабнай для гандляроў вуліцы Вароўскага ўлады арганізоўвалі сезонныя кірмашы сельскагаспадарчай прадукцыі. Але ж з лістапада гандаль сельгасвытворцаў-прыватнікаў быў канчаткова забаронены.

— 1 лістапада з міліцыяй прыйшлі на рынак і кажуць нам: «Кыш, тут гандляваць нельга», — гаворыць Марыя Трызна. — Ці на «Сонечны» ідзіце, ці да крамы «Суседзі», ці куды хочаце». Мы прысунуліся туды, дзе адзенне, стаялі на праходзе, гандлявалі на скрынях, адзін на адным, на «галовах». Цяпер вось нам паабяцалі, што з 1 сакавіка зробяць новы рынак у цэнтры. Дык жа трэба было спачатку зрабіць, а потым выганяць нас з вуліцы Вароўскага! Мы б пеpайшлі без усякіх размоў!

Мы вырашылі звярнуцца ў райвыканкам па адпаведную паперу, каб потым у жлобінскіх улад не было магчымасці адмахнуцца ад сваіх абяцанняў. Цытуем ліст за подпісам намесніка старшыні райвыканкама І.С. Аслюка: «Пытанне арганізацыі гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй у раёне рэчавага і былога калгаснага рынку знаходзіцца на кантролі. ААТ «Візаві-гандаль» на міні-рынку за гандлёвым цэнтрам «Свет моды» з 1 сакавіка 2015 года для гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй прадастаўць 114 месцаў. Зацверджана схема размяшчэння гандлёвых радоў, разглядаецца пытанне закупу абсталявання»…

Мы часта наракаем на тое, што людзі звяртаюцца да вышэйшых інстанцый, абмінаючы мясцовыя ўлады, — са скаргамі, якія паспяхова можна было б вырашыць на месцы, не даводзячы праблему да сацыяльнай напружанасці.

І што бачым на самой справе? Вось людзі, якія спачатку даверыліся сваёй уладзе (да слова, згодна з указам № 498 і дырэктывай № 2), але… вымушаны былі ісці далей, звяртацца да вышэйшай інстанцыі.

Няўжо нельга было вырашыць пытанне на месцы? Знайсці кампраміс паміж новым уласнікам, дзяржаўнай уладай і грамадзянамі? Мы прывыклі казаць: маўляў, не працуе дырэктыва № 2, законы… Насамрэч, не нарматыўныя акты прымаюць рашэнне, а чалавек. Не нарматыўныя акты павінны прымусіць працаваць, а ўлада на месцах — перэтвараць іх нормы ў жыццё. Тады і давер да яе будзе, і пытанні пачнуць вырашацца. Але часта атрымліваецца, што найпрасцей забараніць, чым чула паставіцца да сваіх жыхароў і стварыць для іх умовы…

**Вікторыя ВІНАГРАДАВА.**


**ИЗМЕНЕНИЕ В ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (организатор аукциона) информирует: в извещение о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимости **ОАО «Могилёвтранс»** (продавец), расположенных по адресу: **г. Могилёв, ш. Гомельское, 5**, опубликованное в газете «Звязда» от 20.11.2014 г., вносится изменение: Вместо «Земельный участок пл. 0,10 га» читать **«Земельный участок 0,125 га».**

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

УНП 700010127


■ Святы

# ПІШЫЦЕ ПІСЬМЫ… ДЗЕДУ МАРОЗУ — ТАКСАМА!

**Крыху больш за месяц засталося да Новага года. А значыць, зараз самы час загадваць жаданні, пісаць пра іх Дзеду-Чараўніку і пры гэтым на канверце з маркай правільна пазначыць адрас. Каму? Дзеду Марозу. Куды? Белавежская пушча, 225063 в. Камянюкі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.**

Апусціць лісты, адрасаваныя чароўнаму атрымальніку, можна ў круглай і пасылачнай залах сталічнага паштамта (там ёсць спецыяльныя скрынкі), а таксама ў любым аддзяленні паштовай сувязі. Зрабіць гэта могуць як самі дзеці, так і іх бацькі, бабулі і дзядулі… Яны ж, дарэчы, маюць шанц скарыстацца паслугай РУП «Белпошта» і замовіць для сваіх блізкіх адмысловае віншаванне ад Дзеда Мароза: арыгінальна аформлены ліст, ён жа з дзіцячай кніжкай-размалёўкай, а то і з наклейкамі, галаваломкамі або сімвалам 2015 года ў выглядзе заплечнічка, пенальчыка ці мяккай цацкі.




Чароўны канверт ад Дзеда Мароза паштальён даставіць адрасату напярэдадні Новага года. Афарміць і аплаціць заказ можна на сайце РУП «Белпошта» www.belpost.by, а таксама ў любым аддзяленні паштовай сувязі краіны ці ў паштальёна.

Спяшайцеся: з 20 па 30 лістапада 2014 г. у рамках святкавання Сусветнага дня дзіцяці на навагоднюю паслугу дзейнічае зніжка.


ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК
ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ)
«СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0»
**с 27 ноября 2014 года**

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Сроки | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **до 6 месяцев** 90–180 дней | **от 6 месяцев до 1 года** 181–370 дней | **от 1 года до 2 лет** 371–740 дней | **от 2 до 5 лет** 741–2000 дней |
| **Белорусские рубли** | | | | |
| 1 – 10 000 000 | **28,0** | **29,0** | **30,0** | **30,3** |
| 10 000 001 – 50 000 000 | **28,1** | **29,1** | **30,1** | **30,4** |
| 50 000 001 и более | **28,2** | **29,2** | **30,2** | **30,5** |
| **Доллары США, Евро** | | | | |
| 1 – 500 | **4,5** | **5,2** | **5,5** | **5,8** |
| 501 – 5 000 | **4,6** | **5,3** | **5,6** | **5,9** |
| 5 001 и более | **4,7** | **5,4** | **5,7** | **6,0** |
| **Российские рубли** | | | | |
| 1 – 15 000 | **8,40** | **8,80** | **9,10** | **9,30** |
| 15 001 – 150 000 | **8,50** | **8,90** | **9,15** | **9,40** |
| 150 001 и более | **8,60** | **9,00** | **9,20** | **9,50** |

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

белагропромбанк
традиции будущего

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Сямейная газета
Выпуск № 17 (21)



## УСПОМНІЦЬ УСЁ

«Кажуць, дзеці цяпер пайшлі надта разумныя: у камп'ютарах разбіраюцца з маленства, на тэлефоны самі гульні і песні запампоўваюць. Але ж яны элементарных рэчаў не разумеюць! Я свайму дзяленяне ў слупок ужо і так, і гэтак тлумачыла — глядзіць на мяне, як на новыя вароты, ківае, а сам рашыць не можа...». Гэтую поўную абурэння прамову я пачула нядаўна ад знаёмай — прадстаўніцы майго пакалення, каму сёння паміж 30 і 40.

Пачула... і не стрымала ўсмешкі. Бо некалі, гадоў «-цацаць» таму, мы жылі ў суседніх дварах і гулялі на адной пляцоўцы. І я вельмі добра памятаю, што гэтай жанчыне, якая тады была задзірлівай і непаседлівай дзяўчынкай, таксама куды больш падабалася гуляць у хованкі і «казакоў-разбойнікаў», чым займацца матэматыкай. І нават праз гады «чую», як маці сарамаціць яе праз расчыненае акно: «Наташа, што такое?! Чаму ўрокі не зроблены, а ты гуляць збегла? Ану, хутка дадому! Я больш у школу чырванець перад настаўніцай не пайду!»

Чамусьці вельмі многія дарослыя забываюцца на тое, якімі самі былі ў дзяцінстве. І потым шчыра здзіўляюцца, калі бацькі ці старэйшыя сваякі распавядаюць гісторыі кшталту: «А памятаеш, як вы з суседскім хлапчуком у пад'ездзе кітайскія пістоны падпалілі, а яны задымілі тры паверхі і мы ледзь пажарных не выклікалі?» Або калі знаходзяць у сямейных фотаальбомах даўнія фота саміх сябе ў сітуацыях, пра якія лепш бы не ўспамінаць. Вырастаючы, мы часта, падсвядома ці наўмысна, падманваем саміх сябе, выкрэсліваючы ўласныя негатыўныя якасці і перабольшваючы станоўчыя. А потым, бы ў люстэрку, бачым тыя самыя рысы ва ўласных дзецях і ўсклікаем: «У каго ж ты такі?!» — ігнаруючы бабуліну згадку, што малы — копія цябе ў дзяцінстве.

Я не заклікаю, безумоўна, у любых выпадках рабіць з дзяцей чыстых анёлаў, апраўдваць і дараваць ім усё. Але, перш чым настойліва пхаць у плаксівую дачку міску грэчкі, пагражаючы ёй у выпадку адмовы пазбаўленнем мульцікаў ды іншых даброт, можа, варта спыніцца на хвілінку і ўзгадаць, што тую самую кашу вы ў дзяцінстве крадком, пакуль мама не бачыць, змывалі ва ўнітаз? А да таго, як чытаць сыну маралі: «Мужчыны не плачуць, цярпі, здаць кроў з пальца — гэта зусім не балюча», — варта сесці разам з бацькамі ды ўспомніць уласныя «канцэрты» ў паліклініцы? (Напісала і зразумела раптам, што за два-тры выбрыкі, здзейсненыя ў маленстве і падлеткавым узросце, мне, па шчырасці, дагэтуль сорамна перад мамай... Ці мне пасля гэтага незадаволена прыкрыкваць на дачку, калі яна занадта доўга корпаецца, збіраючыся ў садок?)

Ёсць добрае жартаўлівае выслоўе, скіраванае да бабуль і дзядуляў: «Любіце ўнукаў, яны адпомсцяць за вас вашым дзецям». Прыгадвайце яго, калі ласка, часцей, калі сварыцеся на нашчадкаў — і, магчыма, вялікая сварка ператворыцца ў маленькае непаразуменне, не вартае вашых нерваў і дзіцячых слёз.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Трэці ўзрост

# Сакрэты даўгалеццяМікалая Стральчука

**Мікалай Васільевіч Стральчук — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Вясёлы, светлы душой чалавек. Разам з жонкай Марыяй Кірылаўнай яны пражылі ў пасёлку Целяханы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў згодзе і каханні 61 год. Ад чацвярых дзяцей маюць 10 унукаў і 15 праўнукаў. А каб вы бачылі, які Мікалай Васільевіч гаспадар! Ёсць у яго якія хочаш станкі, сваімі рукамі ён робіць здатныя вазкі, змайстраваў са старэйшай дачкой, якой і самой ужо пад 60 гадоў, альтанку і дзіцячую пясочніцу. Плугам, зробленым сваімі рукамі, яшчэ арэ глебу па вясне, выворвае бульбу восенню, вырошчвае багаты ўраджай цыбулі, гарбузоў і нават кавуноў, трымае козы, іграе ў вольны час на гармоніку. А яшчэ ўстае і кладзецца спаць ветэран з малітвай. Можа, таму і на здароўе не крыўдзіцца.**



Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.

### ПАТЭФОН З ВАЙНЫ

Родам Мікалай Васільевіч з вёскі Доўгая Івацэвіцкага раёна. У сям'і раслі тры хлопцы і дачка, Мікалай быў старэйшы. Калі пачалася вайна, яму было толькі 14.

— Усіх забралі, я адзін застаўся ў вёсцы, — успамінае ветэран. — Падаўся ў лес, зрабіў сабе зямлянку, з бочкі — печку; конік да мяне прыбіўся замулены, і так перабіваўся. А ў 1944 годзе забралі ў войска. Пешшу дайшлі да Пінска, там праходзілі падрыхтоўку, а тады — у горад Казельск Калужскай вобласці, у 28-ы стралковы полк. Потым быў пад Варшавай. Хто скончыў тры класы польскай школы, таго вучылі на наводчыка. 11 лютага 1945 года скончылася Ялцінская канферэнцыя, падчас якой Савецкі Саюз узяў абавязацельства ўступіць у вайну з Японіяй, а 13 лютага нас павялі ў лазню і раніцай адправілі пад Манголію, ваяваць з японцамі. Везлі без баявой тэхнікі. Прыбылі на месца, камандзір крычыць: «Хто наводчык?». «Я», — адказваю. «Вось табе «кацюша», камандуйце».

У Мікалая Васільевіча ёсць баявы медаль за савецка-японскую вайну і нават падзяка ад самога І. Сталіна.

...Пасля вайны Мікалай Васільевіч доўгі час яшчэ заставаўся служыць у тых краях. Манголія, Карэя і Кітай пакінулі ўражанні на ўсё жыццё.

— У Манголіі цікава: там няма вёсак, сталіца — два двухпавярховыя дамы, а жывуць людзі каля рэк у юртах, — расказвае Мікалай Васільевіч. — Дзіўны народ: не арэ поле, не сее. І могілак у іх няма. Звычай у іх такі: захварэў чалавек, калі праз дзевяць дзён не паправіўся — садзяць яго на каня, даюць кавалак мяса і пакідаюць у стэпе паміраць. Мы так адну дзяўчыну знайшлі, выхадзілі. Яна ў нас потым доўга посуд мыла. Прапаноўвалі да бацькоў адправіць, а яна катэгарычна адмовілася: казала, што дома яе ўсё роўна заб'юць.

Вось у Карэі беларускаму хлопцу спадабалася.

— У іх там больш-менш нармальныя законы. Можна было сустрэць парачкі на вуліцы. А ў Кітаі ўжо не, там мужчына наперадзе, а праз дзесяць крокаў ззаду — жанчына. Калі пампрэ кітаец, то б'юць у барабаны. Сем гадоў я там служыў, запомніў: фандзы — хата, куня — дзяўчына, кумані — маці.

Там, у Кітаі, Мікалай знайшоў хлопцаў-землякоў: Васіля Хаміцэвіча з Целяханаў, Васіля Джажору са Святой Волі, са сваёй вёскі Доўгая — Барыса Галоўчыка.

— Ляадунскі паўвостраў, Порт-Артур, Чжаньчжоу... З даўніх часоў там стаіць помнік — наша пушка кароценькая, — дадае з гонарам за нашых Мікалай Васільевіч.

А яшчэ расказаў ён гісторыю, як купіў там патэфон і пласцінку з песнямі Русланавай і Кавалёвай. Уключыў на ўсю моц кітаянкам дзяўчатам, а яны слухаюць і плачуць. Чаму, калі слоў не разумеюць? Аказалася, ад таго, што іх так крануў прыгожы голас спявачак. Потым Мікалай Васільевіч патэфон перадаў з Васілём Хаміцэвічам, які дэмабілізаваўся на год раней, у вёску. Уся вёска дзівілася. Танцы якія былі пад патэфон — проста агонь!

— І я з гэтым патэфонам ездзіла ў Чачэрск на радзіму, — не стрымліваецца ад успамінаў і жонка Марыя Кірылаўна. — На вяселле вазіла, 10 кіламетраў пешшу несла гэтую скрыню.

### НА «ВЕЛІКУ» І З ГАРМОНІКАМ

Вярнуўся Мікалай Васільевіч на радзіму ў 1951 годзе. Працаваць пайшоў у сувязь у Целяханы. Там і сустрэў сваю «палавінку» Марыю Кірылаўну, якая прыехала да сястры з Гомельшчыны і засталася працаваць на мясцовай пошце. Вяселле згулялі ў 1953 годзе і сталі жыць у хатцы, якую перавезлі з Доўгай.

Першы час Мікалай Васільевіч на працы прападаў суткамі: праводзілі па вёсках радыё, тэлефонную сувязь. Як узгадвае жонка, «як паедзе ў панядзелак, то толькі ў суботу вяртаецца, а я сама з гаспадаркай і дзецьмі «ваявалася».

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

«ЗВЯЗДА» + АНТ

■ У вас будзе дзіця

***«Звязда» працягвае прадстаўляць чытачам маленькіх герояў рубрыкі «У вас будзе дзіця», якая ўжо трэці год выходзіць на тэлеканале АНТ і дапамагае знайсці новыя сем'і дзецям, што па розных прычынах засталіся без бацькоўскай апекі, любові і клопату. 51 дзіця за гэты час ужо апынулася ў сем'ях.***

## Улад



Хлопчыку 7 гадоў, ён жыве ў Мазырскім дзіцячым доме. Як расказваюць педагогі, Уладзік, які сёлета пайшоў у першы клас, — выдатны вучань: старанны, уважлівы, акуратны. А па-за школьнымі ўрокамі гэта звычайны сучасны хлопчык, які любіць бегаць, скакаць, займацца спортам. Па словах выхавальніцы Ірыны Кот, ва Уладзіка мноства захапленняў — ролікі, веласіпед, скейт, але самае любімае — плаванне. На занятках у басейне ён адчувае сябе літаральна як рыба ў вадзе — дакладней, як вясёлы, абаяльны, разумны і гарэзлівы дэльфін; а калі даходзіць справа да спаборніцтваў, то нават старэйшым хлопцам Улад стараецца ні ў чым не ўступаць. «Мы вельмі спадзяёмся, што знойдуцца людзі, якія зробяць для Уладзіка маленькае чараўніцтва і стануць для яго сапраўднымі клапатлівымі бацькамі», — кажуць супрацоўнікі дзіцячага дома.

*Калі вы хочаце даведацца пра тое, як усынавіць Улада, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51. Гэта тэлефон Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Для тых, хто жадае ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэазакрусы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.*

■ Кропка на сэрцы

# ХОЧАШ ЗМЯНІЦЬ СВЕТ ДА ЛЕПШАГА — ІДЗІ І РАБІ

**Ёсць людзі, якія, убачыўшы пэўныя праблемы ў грамадстве, не застаюцца абыякавымі і імкнуцца знайсці выйсце. У іх звычайна ёсць своеасаблівы план: яны «ўскалыхваюць» грамадскасць, звяртаюцца да прэсы, сустракаюцца з дэпутатамі, падтрымліваюць спецыяльныя праекты, прапануюць ідэі... Бывае, што гэта ў іх атрымліваецца і сітуацыя насамрэч паляпшаецца, а бывае, што намаганні так і не маюць поспеху...**

**Ёсць і іншыя, якія таксама стараюцца дапамагчы. Але яны не кідаюцца ў бой з «сістэмай», а проста робяць тое, што ў іх сілах. Менавіта такіх людзей аб'яднаў сацыяльны цэнтр адаптацыі, рэабілітацыі і адукацыі «Жыватворная крыніца» для дзяцей-сірот, дзяцей-інвалідаў, а таксама дзяцей, якія аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.**

Усё пачалося з таго, што некалькі чалавек, прыхаджан храма Серафіма Сароўскага, вырашылі дапамагчы выпускнікам школы-інтэрната для дзяцей з псіхафізічнымі асаблівасцямі. Яны ведалі, што тым, хто выхоўваўся ў інтэрнатных установах, вельмі цяжка адаптавацца ў грамадстве. А дзецям, якія да свайго «выхавання» маюць яшчэ і нейкія дыягназы, — складаней у разы.

— Мы прапанавалі выпускнікам сваю дапамогу, і дзеці адгукнуліся, — расказвае **кіраўнік сацыяльнага цэнтра адаптацыі, рэабілітацыі і адукацыі «Жыватворная крыніца» Ірына ПЕТУХОВА.** — Некалькі чалавек сталі апякаць гэтых дзяцей: вучылі іх планаваць свой бюджэт, хадзілі з імі ў крамы, дапамагалі абсталяваць кватэры, плаціць за камунальныя паслугі, увогуле вучылі весці гаспадарку. Хлопцам расказвалі аб мужнасці, дзяўчынкам — аб жаноцкасці. Прыхаджане стараліся для дзяцей стаць сябрамі, хадзілі адно да аднаго ў госці, мяняліся рэцэптамі смачных страў...

Спачатку вернікі ўзрадаваліся, што ў іх трошкі атрымліваецца, што дзеці ахвотна ўсяму вучацца, дасягаюць поспехаў, але... Неўзабаве дзяўчаты сталі прызнавацца, што яны... цяжарныя.

— Мы, шчыра кажучы, такога не чакалі, — прызнаецца Ірына Георгіеўна. — Спачатку адна, потым другая, трэцяя... Дзяўчаты былі вельмі перапалоханыя і не ведалі, што рабіць. Ім здавалася, што выйсці толькі два — зрабіць аборт ці аддаць народжанае немаўля ў дзіцячы дом.

Рашэнне трэба было прымаць хутка. Прыхаджане вырашылі ўгаварыць дзяўчат не забіваць сваіх дзетак і не кідаць іх. Яны абяцалі падлеткам быць побач і дапамагчы маладым маці выхоўваць дзяцей. Валанцёры хадзілі з дзяўчатамі па крамах і набывалі ўсё неабходнае: каляскі, ложкі, крэселкі, адзенне, памперсы і іншае...

Дарослыя разумелі, што дзяўчатам патрэбна яшчэ і дапамога спецыялістаў. Для гэтага быў створаны своеасаблівы цэнтр з назвай «Клуб маладых матуль». Сталі запрашаць для кансультацый гінеколагаў, акушэраў, педыятраў і юрыстаў.

— Мы стараліся даць максімум інфармацыі для цяжарных дзяўчат, — гаворыць Ірына Георгіеўна. — Трэба было ўсё растлумачыць, каб яны не баяліся быць мамамі.

Нарэшце, выпускніцы інтэрната нарадзілі. Валанцёры кожную сустракалі з радзільні, потым везлі дадому, а там разам з імі купалі народжаных немаўлят, вучылі маладых мам іх карміць, мяняць памперсы... Маладыя жанчыны, якія ў дзяцінстве так і не спазналі, што такое мама, самі стараліся быць добрымі маці, хаця і давалася ім гэта нялёгка. Праз нейкі час некаторыя з іх не вытрымалі: сталі выпіваць, не даглядалі сваіх малых. Вернікі хадзілі шукаць жанчын з міліцыяй, пагражалі, што дзетак адбяруць і накіруюць у дзіцячы дом...

— Нават сёння, калі прайшоў ужо не адзін год, гэтыя часы ўспамінаць цяжка, — прызнаецца Ірына Георгіеўна. — Колькі было праліта слёз... Некаторыя мамы адумаліся.


Хатняе заданне дзеці робяць у цэнтры два разы на тыдзень.

Іншыя, нягледзячы на нашы намаганні, так і не здолелі стаць адказнымі матулямі — іх дзетак забралі ў дзіцячы дом.

Немаўляткі, якія засталіся са сваімі матулямі, хутка раслі. Валанцёры па-ранейшаму дапамагалі дзяўчатам, але заўважылі яшчэ адну праблему.

— Справа ў тым, што ў выпускніц інтэрнатаў з псіхафізічнымі адхіленнямі толькі пачатковая адукацыя, — расказвае Ірына Георгіеўна. — Яны навучыліся працаваць, плаціць за кватэру, карміць і апранаць сваё дзіця, але ім было цяжка вучыць дзяцей гаварыць, адрозніваць колер, лічыць і рыхтаваць сваіх малых да школы. Мы разумелі, што неабходна прафесійная дапамога лагапедаў, дэфектолагаў, псіхолагаў і педагогаў. Далі аб'яву ў храме, спадзеючыся, што здолеем знайсці прафесіяналаў для нашых дзетак. І ў нас атрымалася. Такім чынам «Клуб маладых матуль» нібыта перарадзіўся ў сацыяльны цэнтр рэабілітацыі, адаптацыі і адукацыі «Жыватворная крыніца».

Спецыялісты знайшліся таксама сярод вернікаў. Яны сталі рэгулярна займацца з дзецьмі: малодшых навучылі размаўляць, старэйшых падрыхтавалі да школы. Але, нягледзячы на ўсе намаганні, некаторыя малыя ўсё роўна «атрымалі» дыягназы. Сёння гэтыя дзеці ўжо вучацца ў пятых — шостых класах. Цэнтр па-ранейшаму працуе з імі: педагогі дапамагаюць рабіць урокі, стараюцца даць ім дадатковую адукацыю. На базе цэнтра цяпер працуюць гурткі інфарматыкі, англійскай і нямецкай мовы, а таксама розныя творчыя гурткі. Таксама цэнтр сталі наведваць маці, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, і прыводзіць у гурткі сваіх малых. Такім чынам гэтыя жанчыны імкнуліся разнастаіць жыццё сваіх дзяцей, знайсці ім новых сяброў сярод фізічна здаровых дзяцей і пры гэтым навучыць самім прыносіць карысць.

— Мы прымаем усіх дзетак, якія аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, — расказвае Ірына Петухова.— Памятаю, пару гадоў таму да нас прыйшла жанчына ў роспачы: у яе сына былі шматлікія праблемы ў паводзінах. Хлопца спачатку як хулігана ганялі са школ у школу, а потым увогуле сталі прапаноўваць спецыяльную дапаможную школу. У нас жа гэты «хуліган» стаў выдатным артыстам, амаль «зоркай»! Ён навучыўся сябе кантраляваць і ў адной школе вучыцца ўжо два гады. Для маці з сынам гэта сапраўдны поспех. Наогул да кожнага з падапечных у нас індывідуальны падыход, а дзякуючы спецыяльнай адукацыі некаторых вернікаў мы праводзім з дзецьмі своеасаблівую псіхакарэкцыйную працу.

Валанцёры цэнтра ўпэўнены, што праграма сацыяльнай рэабілітацыі для дзяцей была б немагчымай без дапамогі і жадання саміх бацькоў. У цэнтр нельга прывесці дзіця і пакінуць яго аднаго з педагогамі — абавязкова павінен прысутнічаць хто-небудзь з бацькоў. І не проста прысутнічаць, а ўдзельнічаць у агульнай працы. Напрыклад, адны бацькі дапамагаюць зрабіць малым урокі, іншыя працуюць у творчай майстэрні, трэція вучаць карыстацца камп'ютарам, нехта спявае ў хоры, а некаторыя праводзяць рэпетыцыі тэатральнай пастаноўкі, прысвечанай Калядам. Такім чынам, бацькі самі становяцца валанцёрамі і дапамагаюць іншым дзецям. Сёння ў цэнтры займаецца каля 40 чалавек. Разам яны адпраўляюцца ў паломніцкія паездкі і экскурсіі па Беларусі, Польшчы і Балгарыі. На гэтыя мерапрыемствы дзеці зарабляюць грошы самі: у творчай майстэрні яны робяць розныя прыгожыя вырабы і на кірмашах іх прадаюць. Так, на паездку ў Польшчу ім не хапала 500 еўра. Прыхаджане храма дапамаглі сабраць гэтую суму.

— Нас ужо ведаюць, і таму бывае так, што проста ахвяруюць грошы, — гаворыць Ірына Георгіеўна. — Напрыклад, у Балгарыю мы ездзім адпачываць кожнае лета за кошт прымаючага боку. Увогуле, калі нашу групу бачаць на мерапрыемстве ці нават у аэрапорце, мала хто з людзей застаецца раўнадушным. Заўсёды дапамогуць і інвалідныя крэслы выцягнуць з аўтобуса, і сумкі данесці да месца, і пачастуюць чым-небудзь смачненькім. І ўсё гэта цярпліва і добразычліва. А дзеці адчуваюць, што свет прыдатны для іх жыцця, нягледзячы на іх асаблівасці, што заўсёды знойдуцца людзі, якія захочуць пасябраваць з імі. Гэта дае ім сілы жыць са сваімі дыягназамі, а таксама ўпэўненасць у тым, што яны не адзінокія.

**На працягу трынаццаці гадоў яны прысвячаюць сябе працы, за якую ім ніхто не заплаціць. І хварэюць сэрцам за кожнага свайго падапечнага.**

Супрацоўнікі цэнтра не ставяць перад сабой мэты перавярнуць свет, зрабіць людзей больш добрымі і ўважлівымі адзін да аднаго. На працягу трынаццаці гадоў яны прысвячаюць сябе працы, за якую ім ніхто не заплаціць. І хварэюць сэрцам за кожнага свайго падапечнага. Шчыра радуюцца, калі хлопчык з ДЦП прымае рашэнне быць варатарам падчас сяброўскай гульні ў футбол. Ганарацца разам з дзяўчынкай, якая падцягнула свае адзнакі па англійскай мове з «пяцёркі» да «васьмёркі». Яны з задавальненнем прымаюць запрашэнні выступіць на мерапрыемствах горада з тэатральнай пастаноўкай. Яны не змагаюцца за справядлівасць з «сістэмай», а проста робяць тое, што ў сілах зрабіць...

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ**


У творчай майстэрні.

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Насуперак стэрэатыпам

# І Ў ЧЫМ ЖА ІХ ВІНА?

## Бацькі дзяцей-інвалідаў не павінны замыкацца ў сваіх праблемах

**У Мінску прайшоў спецыяльны курс па развіцці патэнцыялу сям'і, якая выхоўвае дзіця з інваліднасцю. Арганізатарамі гэтага мерапрыемства выступілі Прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Беларусі і міжнароднае дабрачыннае грамадскае аб'яднанне «Дзеці. Аўтызм. Бацькі».**

— У мяне ў самой дзіця з інваліднасцю, — прызнаецца **кіраўнік праекта, актывіст міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Іна БЕЛАВУСАВА.** — Мы з мужам звярнулі ўвагу на тое, наколькі стаўленне грамадства да маці, у якой нарадзілася дзіця з інваліднасцю, адрозніваецца ад стаўлення да бацькі. Бацьку заўсёды хваляць: маўляў, малайчына, што не пакінуў жанчыну ў цяжкія часы. А калі ён яшчэ і дзіця ў садок возіць, то ўсё — амаль герой.

У дачыненні да жанчыны ўсё па-іншаму. Па-першае, негалосна лічыцца, што жанчына вінавата ў тым, што нарадзіла хворае дзіця. Такое стаўленне «транслюецца» і ад блізкіх, і ад сяброў, і ад медыкаў і іншых спецыялістаў. Такім чынам на маці пастаянна аказваецца ціск. Калі жанчына пачынае займацца нейкай грамадскай дзейнасцю ці падрацоўваць, ды ўвогуле стараецца не замыкацца ў чатырох сценах, то аказваецца ціск іншага кшталту, маўляў, у цябе ж дзіця з інваліднасцю, табе трэба без перапынку выконваць бацькоўскія і гаспадарчыя абавязкі! Я гэта ўсё адчула на сабе. Таксама ведаю, што ў многіх жанчын не хапае ўнутраных сіл і слоў, каб адстойваць сваю пазіцыю і права на актыўнае жыццё.

Такія стэрэатыпы часта з'яўляюцца прычынай шматлікіх цяжкасцяў, якія адчуваюць бацькі дзяцей з асаблівасцямі. У выніку ўдзел жанчыны ў сферах жыцця, не звязаных непасрэдна з патрэбамі дзіцяці-інваліда, мінімальны. Выкананне такой вузкай ролі на працягу многіх гадоў уздзейнічае разбуральна не толькі на маці, але і на ўсю яе сям'ю.

— Выхаванне хворага дзіцяці звычайна кладзецца на плечы маці, — гаворыць удзельніца курса Людміла. — З таго часу як я нарадзіла, так і не выйшла на працу. Спачатку дзіця было малое, потым выявіліся праблемы і мне прыйшлося аформіць водпуск па доглядзе дзіцяці-інваліда. Аказалася, што маё асабістае жыццё ўвогуле не значыць нічога. А некалі я была паспяховым чалавекам: выкладала ў Гродзенскім універсітэце, пісала вершы, друкавалася... Калі жанчына даведваецца, што яе дзіцяінвалід, яна атрымлівае вялікі стрэс, з якога вельмі цяжка выбрацца: губляюцца мары, надзеі... Пачынаеш бачыць толькі праблемы свайго дзіцяці. Гэта вымотвае да такой ступені, што на сябе проста не хапае часу і сіл. У той жа час мужчыны зарабляюць грошы і могуць дазволіць сабе адхіліцца ад гэтай праблемы. Яны ідуць на працу і забываюць пра яе на восем гадзін. Я не хачу сказаць, што мой муж мне не дапамагае. Проста часцей за ўсё нагрузка па доглядзе дзіцяці — на мне.

Падобныя курсы неабходныя, лічаць іх удзельнікі. Тут можна пазнаёміцца з людзьмі, у якіх такія ж праблемы, і гэтыя людзі могуць падказаць, як яны вырашалі тую ці іншую праблему. Пачынаеш нешта рабіць, вызваляешся ад «шкарлупіны», і якасць жыцця, мікраклімат у сям'і паляпшаюцца. ■

■ Наш фармат

# ЗАСЛОНА АД АГРЭСАРАЎ



**25 лістапада ва ўсім свеце адзначаўся Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю насілля ў дачыненні да жанчын, а ў Беларусі, як і ў шэрагу іншых краін, у чарговы раз стартавала міжнародная кампанія «16 актыўных дзён супраць насілля ў дачыненні да жанчын».**

У гэтыя дні, як паведаміў **кіраўнік упраўлення прафілактыкі Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Алег КАРАЗЕЙ,** супрацоўнікі праваахоўных органаў узмоцняць кантроль за асобамі, якія ўжо былі заўважаны ў праявах дамашняга насілля, а таксама правядуць прафілактычныя размовы з яго патэнцыйнымі ахвярамі, расказаўшы пра існуючыя прававыя нормы, тэлефоны даверу і спецыялістаў з розных арганізацый і ведамстваў, якія могуць аказаць дапамогу пацярпелым.

У аўторак жа ў 29 беларускіх гарадах распачалася сумесная акцыя Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і Дзяржаўтаінспекцыі «Кампанія белай стужкі». Валанцёры выйшлі на дзяжурства разам з патрульнымі і супрацоўнікамі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і ўручалі вадзіцелям-мужчынам святлоадбівальныя элементы з лагатыпам кампаніі, інфармацыйныя матэрыялы і сімвалічныя белыя стужкі. Чалавек, прыняўшы такую стужку, абяцае ніколі не здзяйсняць сам, а таксама не замоўчваць факты насілля ў дачыненні да жанчын і дзяўчат.

Акрамя таго, расказала **каардынатар сеткі некамерцыйных арганізацый па папярэджанні дамашняга насілля Вольга ЯНЧУК,** з 25 лістапада па 10 снежня ў рэгіёнах пройдзе больш за 50 мерапрыемстваў, скіраваных супраць гендарнага насілля: сустрэчы з бацькамі і педагогамі ў дашкольных, школьных і вышэйшых навучальных установах, інфармацыйна-прафілактычныя семінары ва ўстановах адукацыі, культуры, аховы здароўя, трэнінгі для спецыялістаў розных ведамстваў і г.д.



— 19 грамадскіх арганізацый, якія ўваходзяць у нашу структуру, ужо больш за два гады не толькі аказваюць прамую дапамогу пацярпелым ад насілля ў сям'і, але і лабіруюць распрацоўку асобнага заканадаўства ў гэтай галіне, — расказала Вольга Янчук.

Распрацоўка адпаведнага законапраекта — а такія, дарэчы, дзейнічаюць у больш як 100 краінах свету — ужо ўключана ў планы Міністэрства ўнутраных спраў на наступны год. Але пра канкрэтныя тэрміны яго з'яўлення, папярэджваюць спецыялісты, гаварыць пакуль што рана: занадта гэта маштабная і тонкая работа, трэба прадугледзець усе магчымыя нюансы правапарушэнняў і віды адказнасці.

Зрэшты, і сёння станоўчыя зрухі ў гэтай сферы ёсць. Нягледзячы на трывожную статыстыку (сёлета за 10 месяцаў зафіксавана амаль 37 тысяч адміністрацыйных правапарушэнняў у сямейна-бытавой сферы — гэта больш, чым за ўвесь мінулы год), супрацоўнікі міліцыі сцвярджаюць, што гэта не рост колькасці сямейных дэбашыраў і агрэсараў, а лепшае іх выяўленне. Ды і меры ўздзеяння на іх дзякуючы змяненням, унесеным у Закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў», сталі больш адчувальнымі. Напрыклад, усё больш актыўна па просьбах ахвяр дамашняга насілля прымяняецца да агрэсараў абарончае прадпісанне — мера, якая можа ўстанавіць забарону на стасункі, наведванні, высвятленне месцазнаходжання пацярпелага, і нават абавязаць агрэсара пакінуць агульнае жылое памяшканне на тэрмін да 30 сутак. «Найбольш актыўна гэту норму прымянялі ў Брэсцкай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. На сёння зарэгістравана 119 выпадкаў вынясення абарончага прадпісання, — адзначае Алег Каразей, — у тым ліку 85 абавязваюць асобу, якая здзейсніла насілле, часова пакінуць агульнае жылое памяшканне. Таксама сёлета вынесена каля 7 тысяч афіцыйных папярэджанняў агрэсарам, а яшчэ 1,5 тысячы сямейных дэбашыраў пастаўлены на прафілактычны ўлік».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

### МОВАЙ ЛІЧБАЎ

- **Сёлета ў Беларусі зарэгістраваны 103 забойствы і 205 наўмысных прычыненняў цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Кожнае трэцяе з іх здзейснена ў дачыненні да блізкіх.**
- **З пачатку работы ў 2012 годзе агульнанацыянальная «гарачая лінія» для пацярпелых ад дамашняга насілля 8-801-100-8-801 прыняла больш за 5600 званкоў. 82% зваротаў — ад пацярпелых, прычым у 95% выпадкаў гэта жанчыны.**
- **Таксама ў 2012 годзе для больш шырокага інфармавання грамадзян аб праблеме дамашняга насілля быў запушчаны абноўлены сайт www.ostanovinasilie.org. Агульная колькасць яго наведвальнікаў за гэты час перавысіла 33,5 тысячы чалавек.**
- **Толькі ў Мінску ў гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей знаходзяцца на ўліку прыкладна 10 тысяч сем'яў, якія звярталіся па псіхалагічную дапамогу.**

■ Вазьму твой боль...

# КУДЫ ІДУЦЬ ГРОШЫ НЯБОЖЧЫКА?




**Нарэшце я сабрала з розных крыніц ахвяраванні за месяц, пералічыла і размеркавала дабрачынныя грошы (на гэта патрабуецца не адзін дзень). Іду ў банк папаўняць рахункі падапечных «Клуба 5000», анкахворых дзяцей. Паўгадзіны я чакаю ў чарзе, яшчэ гадзіну стаю каля касы — рахункаў шмат. На выхадзе з банка атрымліваю навіну: некалькі гадзін таму не стала Сяргея, якому я толькі што паклала суму на лячэнне.**

Размяркоўваць ахвяраванні заўсёды складана і адказна. Я вагаюся кожны раз, калі раблю гэта. Шмат разоў перапраўляю бягучую сітуацыю кожнага падапечнага, часам перадумваю і лішнюю капейку забіраю ў аднаго, каб пакласці ў стос банкнот, адрасаваных іншаму. І, бывае, памыляюся. Як у гэты раз.

Людзі ахвяруюць грошы і думаюць, што іх унёсак абавязкова каго-небудзь выратуе. Ім трэба ведаць, што яны дапамаглі. Шмат хто просіць размоў, патрабуе справаздачы. Я сустракаюся з кожным, каму патрэбны падрабязнасці. Расказваю, тлумачу, адказваю на пытанні.

«А што, калі дзіця ўсё ж памірае? Куды ідуць грошы нябожчыка?» — аднойчы спытаў у мяне Дзмітрый, які перадаў немалую суму на дабрачыннасць.

Тады ў мяне не было адказу. Па сутнасці, няма і цяпер. Адказы могуць быць рознымі і залежыць ад мноства фактараў.

У нас ужо была такая сітуацыя, як сёння з Сяргеем. Я адрывала ад кожнага з падапечных па кавалачку, каб большую суму пакласці на рахунак маленькай Дамінічкі. У яе тэрмінова вырашалася пытанне з лячэннем, часу было мала. А праз пару гадзін пасля папаўнення дабрачыннага рахунку, я даведалася, што Дамінікі не стала. Яе маці, зламаная горам, знайшла ў сабе сілы, каб не затрымліваць грошы, схадзіла ў банк і пералічыла іх іншым дзецям. Думаю, гэта залічылася Дамінічцы ТАМ.

Памятаю, як адна маці раздрукавала вялізны плакат з партрэтам дачкі Насці, зроблены, калі тая была яшчэ здаровай, і павесіла над ложкам у рэанімацыі. Няхай усе глядзяць, якой яна павінна быць і да чаго трэба імкнуцца. Медперсанал перашэптваўся: такі плакат нятанна каштуе — і гэта ў той час, калі сям'я Насці развяла буйную кампанію па зборы грошай на замежнае лячэнне.

Была іншая маці, якая таксама змагла прыцягнуць увагу грамадства да свайго хворага сына. Шмат людзей штодня пералічвала грошы, каб адправіць Андрэя на лячэнне за мяжу. Маці, якая прыехала ў бальніцу ў адзіным старамодным халаце, пачала часта адлучацца на шопінг, з'яўлялася ў абноўках, ладзіла шашлыкі ў лесе каля клінікі. А пасля набыла машыну. Казала, што дзеля Андрэя.

Памятаю, як да «Клуба 5000» звярнулася маці ўкраінскага хлопчыка Дзяніса. Яны лячыліся ў Беларусі платна, і грошай катастрафічна не хапала. Мы сабралі добрую суму і пералічылі на яго рахунак тысячу долараў, астатнім падапечным — па сто. Дзяніса ў хуткім часе выпісалі, бо лячэнне не давала вынікаў. Па інтэрнэце мы сачылі за навінамі пра яго. Праз інтэрнэт даведаліся, што хлопчыка не стала. І ў інтэрнэце ж прачыталі, што на сабраныя ахвяраванні бацькі набылі новую кватэру і пераехалі ў іншы горад. Бо ў старым усё ім нагадвала пра сына. Я добра памятаю, як напісалі валанцёры: «Мы не падзяляем іх поглядаў адносна распараджэння грашыма, але не бяромся асуджаць».

Андрэя так і не павезлі на лячэнне за мяжу. Медыцына яго не ўратавала. А маці наладзіла сваё асабістае жыццё падчас пікнікоў за бальніцай. І на ахвяраванні, што яшчэ засталіся пасля пакупкі машыны, у хуткім часе згуляла вяселле. З гасцямі, лімузінамі, белай сукенкай і вэлюмам — усё, як мае быць.

Насця правяла шмат часу ў коме пад сваім жыццесцвярджальным партрэтам. Яна яшчэ доўга залечвала пролежні, калі апрытомнела, вучылася хадзіць нанова. Сабраныя грошы патрацілі на доўгую і патрэбную рэабілітацыю ў Ізраілі. Яна амаль страціла слых, так і не распрацавала дробную маторыку. Але ўладкавалася на прыстойную працу, знайшла творчае хобі і выйшла замуж. Магчыма, дзякуючы таму партрэту, які дарыў надзею маці, надаваў імпэту ўрачам і невядомым чынам падтрымліваў саму Насцю.

Я кожны раз баюся памыліцца, калі размяркоўваю дапамогу падапечным. Вагаюся нават у тых выпадках, калі перадаюць абутак, а ў нас ёсць двое падапечных з такім памерам. Каму больш падыдуць туфлі? Хто будзе насіць, а ў каго будуць прастойваць? Для каго найбольш актуальна, а хто даносіць старыя? Я баюся падвесці тых, хто ахвяруе дапамогу, і тых, ад каго адымаю, каб даць іншым.

Але мы не ў сілах прадбачыць. Мы не можам загадзя ведаць, дапамогуць нашы намаганні і ахвяраванні ці пойдуць не па прызначэнні. Не можам ведаць, якім будзе гэта «непрызначэнне»: новай кватэрай, машынай, вяселлем, плакатам ці дапамогай іншым дзецям. Ды і не адказваем мы за гэта. Вырашылі дапамагчы — смела дапамагайце. Ахвяруйце і адпусціце: грошы ўжо не вашы. А далей дазвольце распараджацца імі таму, да каго яны трапілі. Мы часам не падзяляем іх поглядаў, але не бяромся асуджаць. Няхай зробяць так, як падкажа сумленне. Ім залічыцца. І вам таксама.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**кіраўнік дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■

■ Парады псіхолага



**На пытанні чытачоў адказвае старшы выкладчык кафедры псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, псіхолаг-кансультант Алена ОСІПАВА.**

## КАБ ДЗІЦЯ ПАСТАЛЕЛА — ДАЗВОЛЬЦЕ ЯМУ ГЭТА!

***«Майму сыну амаль 5 гадоў, а ён усё ніяк не жадае вучыцца несці адказнасць за свае ўчынкі. Калі ён упаў — вінаваты хтосьці іншы, зламаў цацку — зноў гэта не ён, а іншая дзіця ў садку, калі выхавальніца зрабіла заўвагу — значыць, яна дрэнная, а не ён у нечым вінаваты. Пры тым што з мужам стараемся ніколі не цісніць на яго аўтарытэтам і не сварыцца за дрэнныя ўчынкі. Проста шчыра гаворым, што засмучаемся, калі ён падманвае, і стараемся на канкрэтных прыкладах патлумачыць, што добра, а што дрэнна...***

***Падкажыце, як навучыць сына не хлусіць і прызнаваць сваю віну».***

**Алена ВАСІЛЬЧАНКА,** *г. Мінск.*

Алена, адказныя паводзіны дзіцяці пяці гадоў уключаюць у сябе не толькі ўменне несці адказнасць за свае ўчынкі, але таксама права самастойнага прыняцця рашэнняў, права выбару, пэўную ступень волевыяўлення, на якую можа быць здольнае дзіця ў гэтым узросце. Развіццё адказных паводзін дзіцяці — гэта састаўная частка работы па фарміраванні яго самастойнасці. Патрэба ў самастойнасці і незалежнасці ад дарослага, як ва ўчынках, так і ў жаданнях, у дзіцяці асабліва моцна праяўляецца, пачынаючы з трох гадоў. У гэты ж час з'яўляецца і ўстойлівае жаданне самасцвярджэння. Бацькі ж часта або з-за недахопу часу, або з-за няўпэўненасці ў сілах і магчымасцях дзіцяці, ці з-за жадання ўберагчы яго ад траўмаў і іншых непрыемнасцяў робяць за яго тое, што малое цалкам магло б рабіць самастойна. Дзіця ў 5 гадоў ужо здольнае ўключацца ў карысную дзейнасць. Дзеці наогул вельмі актыўныя і з вялікім задавальненнем выконваюць разнастайныя даручэнні дарослых. Імкненне да самастойнасці асабліва вялікае, калі дзіця бярэ ўдзел у сапраўднай працы, якую выконваюць і дарослыя. А імкнучыся рабіць усё за дзіця, мы, дарослыя, наносім яму вялікую шкоду, пазбаўляем яго самастойнасці, падрываем веру ва ўласныя сілы, прывучаем спадзявацца на іншых і нібы пакідаем яго «маленькім».

Вяртаючыся да вашага пытання, Алена, магу меркаваць, што ваш сын якраз і дэманструе паводзіны, уласцівыя для дзяцей маладзейшага ўзросту. У сістэме вашых дзіцяча-бацькоўскіх стасункаў у дзіцяці не склалася ўяўленняў «што можна — што нельга», «што добра, а што дрэнна». Паспрабуйце адказаць сабе на пытанні: ці дастаткова ваша дзіця ўцягнута ў сямейныя справы? Ці ёсць у яго ўсталяваныя нормы і правілы? Ці нясе яно адказнасць за іх невыкананне або ўсё абмяжоўваецца павучальнымі гутаркамі? Ці ёсць у яго магчымасці для праяўлення самастойнасці? Думаю, пасля адказаў на іх вам шмат што стане зразумелым.

## ТАКТЫКА І СТРАТЭГІЯ

***«Мы з мамай часта спрачаемся і нават сварымся на тэму выхавання дзяцей. Справа ў тым, што я не проста хвалю ці крытыкую дачку за штосьці, а тлумачу, да якіх наступстваў прыводзіць той ці іншы ўчынак. У бабулі ж зусім іншая педагагічная тактыка: «Добрыя дзяўчаткі так не робяць!» або «Будзеш так хадзіць, усе будуць смяяцца». І колькі я ні тлумачу, што гэта не выхаванне, а проста памкненне зрабіць дзіця «паслухмяным і зручным для дарослых», мама прапускае ўсё міма вушэй, аргументуючы, што нас жа з братам яна вырасціла добрымі людзьмі (хоць насамрэч да школы нас выхоўвала бабуля). Шчыра кажучы, я не ведаю, як гэта спыніць, калі толькі не забараніць стасункі з унучкай наогул...»***

**Ірына,** *г. Брэст.*

Ірына, адказнасць за дзіця нясуць найперш бацькі. Калі вы выхоўваеце дачку адна — вы і несяце поўную адказнасць. І не важна, якая педагагічная тактыка ў вашай мамы, бо толькі вы вырашаеце, як выхоўваць уласнае дзіця. Мама можа даваць вам парады, а ваша права — прыслухоўвацца да іх або не. І да вашай жа адказнасці адносіцца абмежаванне дзіцяці ад негатыўнага ўплыву прабабкоў. Я думаю, калі мама адчуе вашу рашучасць, рэальную пагрозу адлучэння ад унучкі, яна сама хутка захоча змяніць сваю «тактыку».

З іншага ж боку, бабулі таксама адыгрываюць важную ролю ў жыцці сваіх унукаў: яны могуць даваць тым клопат і любоў, на якую ў мамы і таты наўпрост не хапае часу (бо яны шмат працуюць); у іх ёсць магчымасць разам з унукамі бавіць час на прыродзе, чытаць кніжкі, расказваць пра сваё жыццё і пра жыццё прабабуль і прадзедаў, наогул пра гісторыю сям'і. І гэта вельмі важна. Калі ваша мама пагодзіцца на такую ролю, прыміце яе дапамогу з удзячнасцю!

# ДА АЖЭШКІ З ЛЮБОЎЮ

**Чым звычайны падарожнік адрозніваецца ад апантанага? Першы паедзе ў Гродна, каб убачыць як мага болей тамтэйшага за адзін раз. Метадычна, з картай у руках, ён наведае ўсё, што толькі можна: стары і новы замкі, дом масонаў і аптэку езуітаў, асабняк Масальскіх, «басняцкую» хатку і шкатулку-Каложу на стромкім беразе... А ў выніку ніколі не даведаецца, якое дакладна адценне маюць шпалеры ў «салоніку» пані Элізы, Ажэшкі з Паўлоўскіх, і якую таямніцу тоіць у сабе тамтэйшы камін.**



Гродна, Садовая, шэры-шэры (і сцены, і дах, і абедзве мансарды) аднапавярховы дамок. 1909-ы (дакладна), сакавік (здаецца), холадна (хутчэй за ўсё). У працоўным кабінеце за маленькім «бюркам», заваленым паперамі і кнігамі, 67-гадовая пісьменніца Эліза Ажэшка піша ў лісце да сябра Уладзіслава Рэймонта радкі пра ідэю новай аповесці. Хачу, маўляў, вывесці такі тып мужчыны, які ўвабраў бы тры складнікі. Яна піша гэта пёркам, звычайным, птушыным. А ў шафе, што стаіць праз пакой у вялікім салоне, ляжыць гэтым часам пяро залатое. Шафа прызначана для падарункаў: бранзалецікa з гербам Гродна, куфэрка для рукапісаў, згаданага пёрка...

Шафу і вялікі салон «ад увахода направа» ўбачыць цяпер немагчыма — гэта ўсё ў здані мінулага. Проста ў дзённіку пад датай 1 лютага 1898-га пісьменніца між іншым адзначае: «Перабірала шафу з падарункамі». Вось вам, дарэчы, парада: ніколі не выпраўляйцеся ў падарожжа, не начытаўшыся як след пра месца ці аб'ект сваёй цікавасці, інакш яны застануцца для вас нежывымі, 2D-шнымі, бляклымі. І будзе вам нехта расказваць, як любіла пісьменніца Гродна, а вы і паверыце.

Гродна Эліза Ажэшка не любіла. «Не цярпела», кажучы яе словамі. Хоць шмат пры гэтым для яго зрабіла. А дом на Садовай — наадварот, любіла вельмі, хоць гэтая любоў была спецыфічнай, панурай: «Маё бюрка любае, мой абрыдлы грукат на вуліцы, мая бяда, мая туга». Плаксіўка, адным словам. Выязджаць з Гродна яна не збіралася: у гэтым горадзе жыло яе каханне. Увасоблена яно было ў адвакаце Нагорскім, якога Эліза апантана чакала пятнаццаць гадоў і з якім пражыла толькі два, бо памёр нечакана, на лесвіцы гэтага дома — унутранай, што вядзе ў мансарду. Пакуты душы трансфармаваліся пазней у сардэчнае імкненне да вайскоўца Гадлеўскага, пана Францішка — «сну залатога», «страфы паэмы», «найлепшага».

Што да аповесці, пісанай тут апошняй, у выніку яна не дапісацца. Грукатлівая Садовая ператварыцца ў ціхмяную вуліцу Ажэшкі, а ў шэры дамок замест шматлікіх Ячыноўскіх, Кулакоўскіх, Іжыцкіх і Вольскіх, Эйсымонтаў, Ардылоўскіх, Шпілеўскіх, Нусбаўмаў, піяніста Слівінскага і акуліста Цывінскага, прыяцелек Брыні Прушынскай ды Вілоні Зындрам-Касцялкоўскай, а галоўнае — Францішка Гадлеўскага, што часцей за іншых наведваўся сюды (нават хворы!) на «гогаль-могаль, трошкі смеху і сардэчнай зычлівасці», — пойдуць, шукаючы дзень учарашні, такія самыя апантаныя падарожнікі, як мы. Каб больш — нікуды-нікуды, адно да Ажэшкі, як да даўняй знаёмай, з мэтай убачыць і «бюрка», і «Двух бараноў», і гербарый, які гаспадыня складала з травінак-пялёсткаў сваімі рукамі. Цікава, якімі сродкамі яна карысталася пры іх сушцы, каб захаваліся ажно праз стагоддзе такія натуральныя колеры?..

Вось мы пераступаем парог «салоніка». Ён не здань мінулага, а ўзноўленая рэальнасць. Карціны, фотаздымкі, кветкі, свечкі. Прэтэнцыёзнае (і цьмянае, лепш не глядзецца) люстэрка над мармуровым камінам... Апошні, між іншым, сапраўдны. У тым сэнсе, што памятае гаспадароў. Як памятаюць іх яшчэ два прадметы — разьбяны драўляны тамбур і балконная агароджа.

...Апантаны падарожнік ніколі не перакрэсліць уражанне, атрыманае ў адным месцы, нейкім іншым. Ён калі і выправіцца з дамка Ажэшкі яшчэ куды-небудзь у той самы дзень, дык хіба толькі ў касцёл Узвышэння Гасподняга Крыжа на Камуністычнай, дом №1 — каб паглядзець на рэнесансныя скульптуры, на якія глядзела ў 1855-м падчас вянчання з Пятром Ажэшкам шаснаццацігадовая паненка-пісарка Эльжбета Паўлоўская. «Ратуй, Божа! Не ўводзьце ёй гэта ў галаву!» — наказвала старэйшая Паўлоўская тым, хто заўважаў у выпускніцы Варшаўскага пансіёна сясцёр-сакраментак літаратурныя здольнасці. Пані Францішка, так звалі маці, была другой жонкай вядомага і паважанага гарадзенца — старшыні павятовага суда, «вальтэр'янца», кіраўніка масонскай ложы Бенедыкта Паўлоўскага. Своеасаблівая была жанчына, калі мякка казаць. Капрызліва-дэспатычная шукальніца міражоў. Яе партрэт вісіць цяпер над «бюркам». Глядзіш і думаеш: ці не з гэтай Францішкі пісалася Франка для «Хама»?..

Падарожнічала
Святлана ДЗЯНІСАВА.

## Паслядоўнікам

Шэры дамок у Гродне на былой Садовай, цяпер Ажэшкі (блакітны нумар на зграбненькай шыльдзе — 17) займае інфармацыйна-адукацыйны цэнтр Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага. Рамантычны «салонік» і ўтульны (не хочацца пакідаць!) кабінет пісьменніцы аб'яднаны пад велічнай назвай «мемарыяльны пакой». Ну і няхай яно так — афіцыйна і строга. Усё роўна пасля не пакіне адчуванне, што наведалі вы не цэнтр, а ўласнай персонаю пані Элізу, якая ў дзень вашага візіту была ў выдатным настроі. Вы нават пачулі (ці здалося вам?), як пан Гадлеўскі, пракашляўшыся, чытае прысутным «Восень» Пушкіна, як рабіў ён гэта тут, бывала: *Дни поздней осени бранят обыкновенно, но мне она мила, читатель дорогой...* Нясумнай вам восені і паэтычных вандровак!

## Рамантыкам

За сем вёрст ад Гродна «ў гміне Верцялішкі» ёсць вёска Путрышкі. «Здзівішся, вычытаючы наша месца, з якога пішу. Яно бо трохі дзікае, але перарабі яго сабе на Пятрушкі, як мы гэта зрабілі, бо запамінаць лацвей», — так піша пісьменніца ў лісце да сябра Леапольда Меета, не вельмі ўдалага літаратара, затое паспяховага калекцыянера і бібліяфіла. Пані Эліза здымала тут пакоі, а па сутнасці — альтанку. Будзеце ехаць у Гродна з боку Верцялішак-Путрышак — ведайце: ні пакояў тых, ні «маленькага дворыка», ні тым больш «сардэчных гаспадароў» даўно не існуе. Калі хочаце пабыць яшчэ дзесьці ў месцы, што помніць Ажэшку, пракладзіце маршрут праз Флярыянава ў Ляхавіцкім раёне. «Скажыце фларыянаўскаму бэзу, каб да майго прыезду не адцвіў», — так яна пісала колішнім гаспадарам сядзібы, якую быццам бы збіраюцца рэстаўраваць.



### ■ Пра харчаванне

## На фаст-фуд не зггаджацца

«Грыбкі» пры дарозе, не кажучы пра больш «грунтоўныя» збудаванні, толькі на павярхоўнае меркаванне сустракаюцца часта. На справе можаш ехаць, ехаць, ехаць, ехаць... Да таго ж іх не заўсёды прыбіраюць (і не ўсе падарожнікі абедаюць так, каб прыбірання пасля іх не патрабавалася). А прыдарожныя «корчмы» ў большасці сваёй замест таго, каб частаваць падарожнікаў нечым сапраўдным, прапануюць ім у лепшым выпадку фастфуд і каву «чатыры ў адным» (амаль кава, звышцукар, нейкія тэхнічныя вяршкі (з чаго іх, цікава, робяць?) і пластмасавую палачку замест лыжачкі (хто прыдумаў?!). Сапраўдныя корчмы — з карчмаркай у клятчастай спадніцы і драўлянымі лаўкамі ды пры гэтым без піцы ці фры ў меню — гэта амаль казка. Падарожніку ж патрэбна якраз яна, казка, бо перахапіць хот-дог на АЗС можна любым іншым разам, едучы ў камандзіроўку, і няхк не хочацца рабіць гэта ў свята, што завецца **вялікай вандроўкай** у прасторы і часе.

Між іншым. Смачна, прыгожа і настраёва — у карчме «У Тадэвуша» ля доміка Тадэвуша Касцюшкі, насупраць палаца Пуслоўскіх пад Косавам. Там толькі посуд не адпаведны — з карычневага шкла, як было модна ў 90-я XX стагоддзя. Ці ўжо памянялі? Хай бы...

### ■ Што бывае

## Неспадзяванкі

Калі мы ладзілі вандроўку ў слаўны Полацк, малодшанькаму, Паўлічку, ледзь споўнілася шэсць. Пасля першага дня, праведзенага ў разгляданнем варштатаў і фаліянтаў, шрыфтоў ды ініцыялаў, выехалі на начлег на Ушачу, каб назаўтра, налавіўшы зранку рыбы на сняданак, зноў выправіцца ў Полацк. Назаўтра быў, помніцца, Спас — самы час вандраваць па святынях.

— Спачатку Сафійскі сабор, — абмяркоўваем, уладкоўваючыся ў палатцы, план перамяшчэнняў.

Сцямнела, касцёр згас, на небе ні зоркі, навокал цішыня, і нават коніки з сабою не спрачаюцца. І раптам:

— Пі-пі... Пі-пі-пі. Пі-пі-пі-пі! — прызыўна і ўсё больш настойліва.

Які там сон! Ліхтарыкі ў рукі — і шукаць, каму патрэбна дапамога. А вось што аказалася: у пагнутую бляшанку з-пад нейкага напою, пакінутую, відаць, папярэднікамі, залезла мышаня. А выбрацца назад не здолела, таму і верашчала. Выратаванае жыццё напярэдадні вялікага свята — гэта падвойнае свята. Адзначылі яго раніцай наварыстай юшкай.

— Цяпер можна і на Сафійскі забор лезці, — падсумаваў наш Паўлічак.

## Далёка і блізка

✓ Касцюміраваная сярэднявечная дзея пад назвай «Фестываль Эскаляд» з тэатральным штурмам крэпасці чакае аматараў гістарычных авантур з 6 снежня ў Жэневе. І справа не столькі ў тым, што дзея гэта адбываецца ў гонар перамогі над войскамі герцага Савойскага, якога ўжо чатыры стагоддзі няма, колькі ў тым, што «эскаляд» (або «эскалядэр») — гэта штурм пры дапамозе лесвіц. Вось адкуль узяўся эскалатар.



✓ Да 20 снежня ў Санкт-Пецярбургу — Зімовы рэстаранны фестываль. Ці то ў меню, ці то ў праграме: савецкі навагодні стол, калядная індычка, равіёлі з пельменямі і панкейкі з аладкамі (адчуваеце розніцу?), а таксама парад зімовых гарбат. Пра глінтвейны не паведамляецца.

✓ У доме, што быў 38-м на вуліцы, якая звалася Праабражэнскай, з 1863 года існавала карэтная фабрыка Лейбмана і майстэрня пры ёй. Гэты Лейбман увёў у Мінску новую паслугу: замену жалезных колаў на гумавыя. Ці шмат было тых, што жадалі змяніць «абутак», невядома, але на транспартныя сродкі таго часу зірнуць можна хоць сёння: у Верхнім горадзе адкрыўся музей карэт. Прыходзьце на вуліцу Кірылы і Мяфодзія, 8 — з серады па нядзелю ад 11-й да 19-й.



✓ Хто мог думаць, што міжнародны тэатральны фестываль — падзея апетытная? Дзясяты «Сезон Станіслаўскага» пачынаўся ў кастрычніку «Ванільнай марай». Чым ён будзе заканчвацца ў снежні? Там, на месцы, і праверыце, калі патрапіце ў Маскву да 18-га.

✓ Самае прывабнае ў халодную пару памяшканне Дома Ваньковічаў на Інтэрнацыянальнай, 33а, у нашай сталіцы — гэта кухня. І самавар, здаецца, яшчэ гарачы, і ў гаршчочку стыне верашчака. Але калі ўжо апынуліся ў кухні, то варта і па астатніх пакоях прайсціся, ці не так? Сярод экспанатаў тут шмат што ўражвае, але сутнасць не ў тым. Проста гэты дом менавіта ўперадзін'е робіцца нейкім асабліва ўтульным. Дык чаму б не падарыць сабе хвілінкі ціхай радасці напярэдадні калядных клопатаў? Дзверы тут адчыняюцца лёгка з 10 раніцы да 6 вечара ў любы дзень, акрамя нядзелі і панядзелка, а «пярэдній» заўсёды чакаюць, каб дапамагчы ўладкаваць паліто.



✓ 3 снежня, у сераду, Тэатр юнага гледача запрашае на «Аднакласнікаў» — спектакль пра здраду і шчасце скрозь слёзы і смех, з загадкавай незнаёмкай і «трупам» (спакойна: двукоссе!). Добрая альтэрнатыва тым «Аднакласнікам», што паспелі ўжо надакучыць.



# Сакрэты даўгалецця Мікалая Стральчука

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— У сувязі ў мяне быў конь і акардэон, — успамінае Мікалай Васільевіч. — Адпрацуем, а потым я расцягваю акардэон... Падыходзяць да мяне мясцовыя, пытаюць: «Можа, вы танцы зробіце?»

— Зраблю, — адказваю, — але там у мяне хлопцы галодныя.

— У трэцюю хату заходзьце, там пакормяць.

— Каб не акардэон, то з голаду б паўміралі. Цяжка было пасля вайны, галодна. Але людзі былі добрыя, вясёлыя. Жыццярадасныя.

Потым Мікалаю Васільевічу на рабоце далі веласіпед. На ім ён ад'ездзіў больш за 40 гадоў. Як казала жонка, той «велік» яшчэ жывы і да нядаўняга часу муж на ім ездзіў у магазін ці куды яшчэ па хатних патрэбах. Раўнаваць мужа — вясёлага гарманіста, у маладосці ёй не было калі. Калі была свабодная часіна, Марыя Кірылаўна і сама была душа кампаніі, завадатар і спявачка.

Мікалай Васільевіч рабоце быў адданы: працаваў яшчэ колькі гадоў і на пенсіі. Сярод працоўных узнагарод ёсць медаль «Ветэран працы», знакі «Ударнік працы», «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва». Удзячны ветэран, што сувязісты яго не забываюць і цяпер, клічуць на святы, віншуюць, дапамагаюць.

Паднімаць дзяцей было цяжка, успамінае пажылая пара. Хатка была малая, а дзяцей — чацвёра. Хацелі папрасіць лесу, каб трохі дабудаваць яе, а кіраўніцтва дало загад будаваць хату, як трэба. Жылі самі ў малой хаце, а вакол яе пачалі будаваць новую, вялікую. Потым прыстасаваліся і перанеслі хатку з сярэдзіны новай на іншае месца, за тры дні склалі і печ паставілі. І на момант прыезду, дарэчы, старых мы засталі ў той жа маленькай хатцы. У новай ідзе рамонт, падводзяць газавае ацяпленне.

— Тут ужо чатыры пакаленні змянілася, — кажа гаспадыня. — А сама хата стаіць за свой век на пятым мо месцы. Яна маленькая, але цёпленькая і нейкая вельмі ўтульная.

Толькі калі памёр сын (у 42 гады), гора падкасіла жанчыну — яна перастала бываць у кампаніях, спяваць. І сёння без слёз не можа гаварыць пра гэта. А Мікалай Васільевіч ратунак ад гора шукаў у працы, у занятках па гаспадарцы.

## БУБНЫ СА ЗВАНОЧКАМІ ДЫ ВАЗКІ ПА-КІТАЙСКУ

Ён і цяпер на гармоніку іграць заўжды гатовы. Іграе, усміхаецца вачыма і спявае.

Любоў да музыкі «загарэлася» ад швагра, які без пальцаў на адной руцэ «рэзаў» на гармоніку. Ад яго і навучыўся Мікалай. Прычым, не толькі іграць, а і рамантаваць інструменты. Аляксею Богдану, свайму сябру, мо пяць гармонікаў адрамантаваў. Кожны год на працягу апошняга дзесятка ён з ім на 9 Мая вядзе святочную калону на мітынг. Багдан іграе, а Мікалай Васільевіч на барабане дапамагае.



Дарэчы, іх ветэран таксама ўмее вырабляць. У яго іх цэлая калекцыя — паўтара дзясятка. Адзін падарыў зямлячцы Тані Цыркуновай, і паехаў барабан Стральчука ў Мурманск. Барабаны, сама бачыла, — звонкія, са званочкамі. Аказалася, у аснове — нацягнутая цяплічная плёнка.

Сёлета Мікалай Васільевіч прымаў удзел у раённым конкурсе «Ветэранскі падворак-2014». Прыслалі адтуль падзяку. І сапраўды, слаўны гаспадар Мікалай Стральчук: у агародзе было поўна сёлета цыбулі, бульбы, памідораў, гарбузоў і нават кавуноў, у хлеўчыку цудоўна сябе адчуваюць 4 казы і 2 казлы.



— Каб не козы, не выжыла б мая гаспадыня, — кажа Мікалай Васільевіч. — Пяць гадоў па бальніцах гавала, а як стала піць казінае малако, ачуняла.

У іншых гаспадарчых пабудовах ёсць у Стральчука станкі: такарны і свідравальны. А якія вазкі вырабляе майстар! Зачапіў пальцам — і ён выехаў з хлеўчука, лёгенькі, бы пушынка. На веласіпедных колах, без восі. Некалькі латак металічных прыкручана да драўлянай асновы, каб колы трымаліся.

— Такія вазкі я ў кітайцаў падгледзеў, — кажа ён. — Там паўсюль павозкі на веласіпедных колах. А я думаю: чаму б і сабе такі не зрабіць? І зрабіў ужо не адзін. Ён і лёгкі, і трывалы. Можна лёгка самому два і больш мяхоў везці. І плужок сам змайстраваў. Сам саджу бульбу, сам магу выкапаць.

## ПАВЯНЧАЛІСЯ ПРАЗ ПАЎВЕКА

У царкву Марыя Кірылаўна хадзіла заўсёды. З сяброўкамі стаялі на службах, потым храм прыбіралі. Калі распачалі рамонт, то і Мікалая Васільевіча прыцягнулі да будаўнічых работ. Сем гадоў той бясплатна працаваў качагарам у царкве. Служыць у храме Мікалаю Васільевічу падабаецца. І дома ён не кладзецца спаць, пакуль не прачытае малітвы, і ранкам не забудзе памаліцца. У сілу малітвы ветэран моцна верыць.

— Я ведаю такую малітву, што калі будзеш яе чытаць тры разы ранкам і тры разы нанач, то паправішся, а калі не хворы, то і не захварэеш, — сцвярджае ветэран. — Але самая моцная малітва — «Ды ўваскрэсне Бог». Чытаючы яе нанач, не баюся класціся спаць. Яна ахоўвае і ад зладзеяў. Быў у мяне выпадак такі: у дачкі ўкралі веласіпед. Тры дні я маліўся, а на трэці дзень яго прывялі і паставілі ёй у двор. Во як!

Па жыцці Мікалай Васільевіч добразычлівы чалавек. Нікому злога не жадае, здаецца, і сам не пакрыўдзіўся ні на кога. У гэтым, думае, і сакрэт даўгалецця.

— Што каму раблю, грошай не бяру. Парашкоў сам не п'ю, толькі хіба грып які ўваб'ецца. Парачку тады магу выпіць. А так не. Парашкі ўплываюць на «матор». Шабельнік трэба піць. Ён ад 90 хвароб дапамагае. І суставы балець не будуць, — раіць ветэран і дадае: — Мы з жонкай павянчаліся гадоў дзесяць таму. Трэба правільна рабіць усё. Па-божаму. Дзве пары нас было. Вянчаў айцец Васіль Лавіцкі. Хор з Жыровіц спяваў нам...

— Сукенку вянчальную і касцюм ягоны мы хаваем на смерць, — дадае жонка. — Усіх братоў ён хаваў, хоць старэйшы ў сям'і, ветэранаў праводзіць у апошні шлях...

— А мне трэба жыць — відаць, так Бог хоча... Давайце я лепш вам сыграю песню, якую вы яшчэ не чулі, — зноў прапаноўвае Мікалай Васільевіч.

І гармонік жыццярадасна спявае...

**Валянціна БОБРЫК.**
**Фота Валерыя МІСКЕВІЧА і з архіва сям'і.**

■ Пра нас

# БАЦЬКІ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ

**Калі немаўля толькі з'яўляецца на свет, яно поўнасцю залежыць ад сваіх бацькоў, якія спрабуюць акружыць яго клопатам і любоўю. Але з гадамі дзіця ўсё менш хоча быць залежным ад мамы і таты, а ў пэўны перыяд свайго жыцця і зусім пачынае з імі канфліктаваць, спасылаючыся на неразуменне і нездольнасць знайсці агульную мову. Аднак галоўнае, што варта памятаць любому чалавеку і ў любым узросце — гэта тое, што бацькі жадаюць толькі лепшага, і да іх думак і парад варта прыслухоўвацца. Паглядзіце на гэтую жыццёвую інфаграфіку. Магчыма, у гэтых малюнках вы пазнаеце і ўспомніце сябе ў дзяцінстве. І, спадзяёмся, добра задумаецеся... А таксама варта яе паказаць і сваім дзецям. Можа, задумаюцца і яны. Было б добра.**



■ На свае вочы

# ЖАНЧЫНЫ НЕ ЖАДАЮЦЬ ЧАКАЦЬ

## І змагаюцца супраць мужчынскага «шавінізму»



ШВЕДСКАЯ спецыфіка заключаецца ў імкненні развіваць гендарны падыход да падбору кадраў. Ужо сам факт таго, што рэдакцыю міжнароднага вяшчання, адну з галоўных на тэлебачанні, узначальвае жанчына — Інгрыд Тэрнквіст — гаворыць аб многім.

Сёння ў складзе рэдакцыі — таленавітыя, энергічныя і здольныя эфектыўна працаваць нават у «гарачых кропках» маладыя журналісткі. Адна з іх свабодна размаўляе на англійскай мове і яшчэ валодае экзатычнымі для Швецыі мовамі: акрамя афіцыйнай мовы Ірана фарсі, ведае і дары (адну з дзвюх дзяржаўных моў Афганістана), а таксама размаўляе на курдскай. Натуральна, гэта дапамагае ёй у час камандзіровак у небяспечныя рэгіёны, дзе працягваюцца ваенныя канфлікты.

Падрыхтоўка журналістаў, якія наведваюць «гарачыя кропкі», абавязкова ўключае праходжанне штогод спецыяльнага курса з экзаменам па выпрацоўцы навыкаў паводзін у няштатнай сітуацыі: захоп у заложнікі, абстрэл, кулявое раненне і іншыя верагодныя непрыемнасці. Вучаць таму, як правільна карыстацца бронежылетам, як паводзіць сябе ва ўмовах прыстаўленай узброенай аховы і г.д.

Рэдакцыйная палітыка Інгрыд Тэрнквіст зразумелая: даваць у эфіры слова носьбітам супрацьлеглых (ці, як выказалася Інгрыд Тэрнквіст, кантрасных) пунктаў погляду і, разам з тым, мець уласную пазіцыю па гэтай праблеме, мець крытычнае стаўленне да яе і захоўваць свой твар. Вы скажаце, што такую рэдакцыйную палітыку заяўляюць многія сумленныя журналісты ў большасці еўрапейскіх краін. Але, заўважым, заяўляць і прытрымлівацца — розныя рэчы. У шведскіх супрацоўнікаў міжнароднага тэлевізійнага вяшчання атрымліваецца мець свой твар.

ШВЕДСКАЯ спецыфіка тэлебачання прасочваецца і ў падыходзе да асвятлення і абмеркавання злабадзённых тэм. Раней у пераважнай большасці тэлеперадач у якасці аўтарытэтных экспертаў выступалі мужчыны. Іх слова было важкім і вызначальным, а жанчыны зрэдку ўстаўлялі ў кантэкст гутаркі «свае пяць капеек». З часам сітуацыя пачала мяняцца. Усё больш жаночых твараў з'яўлялася на блакітным экране. Але, як палічылі прыхільніцы гендарнай роўнасці, усё роўна мала. І вось з 2006 года рэдакцыя вядзе ўлік гендарнага балансу ў эфіры: штодзень падлічваецца колькасць мужчын і жанчын, якія даюць інтэрв'ю, і тых, хто выступае ў ролі экспертаў на тэлеперадачах, ток-шоу. Вынікі гендарнай выбаркі падводзяцца штомесяц. Не ўсміхайцеся, калі ласка. Да гэтага занятку тут ставяцца вельмі сур'ёзна і ў цэлым пакуль не задаволены статыстыкай. На жаль, мужчын па-ранейшаму больш, іх унёсак больш важкі. Таму калі сёння ў пэўнай перадачы дэманстравалі ў асноўным мужчын, то для размовы ў наступнай перадачы ўжо шукаюць экспертаў-жанчын. І гэта трэба абавязкова рабіць, бо інакш гендарную роўнасць прыйдзецца яшчэ вельмі доўга чакаць, перакананая Інгрыд Тэрнквіст. Жанчыны не павінны быць у іх цені, у тым ліку і тыя, у каго няма шведскіх каранёў. Так талерантна называюць іншаземак, колькасць якіх у краіне за апошнія 10 гадоў падвоілася. Паўстала пытанне адаптацыі гэтых жанчын да шведскага ладу жыцця. Ёсць складанасці нават у тым, што такія жанчыны адмаўляюцца выступаць па тэлебачанні. І тым не менш іх настойліва «цягнуць» у студыю, прапаноўваюць удзельнічаць у важнай для краіны размове на роўных з мужчынамі.

**Каміла зачытала нам спіс нетактоўных пытанняў, якія не варта задаваць бізнес-вумен, якую пасаду яна ні займала б. Сярод іх наступныя: «Як вам удаецца спалучаць бізнес і клопаты аб сям'і?», «Як ставіцца ваш муж да таго, што вы так шмат працуеце?».**

КАМІЛА Вагнер — цудоўны суразмоўца і гарачы прыхільнік барацьбы за правы жанчын. Прычым не ўвогуле за правы, а менавіта ў эканоміцы. У гэтай сферы яна не першы год змагаецца за роўнасць мужчын і жанчын на прамысловых прадпрыемствах. Каміла доўгі час працавала ў Балгарыі, Польшчы, іншых краінах, дзе кансультавала мясцовых прамыслоўцаў і жаночыя арганізацыя, занепакоеныя адсутнасцю на вытворчасці еўрапейскага стандарту роўных з мужчынамі правоў. На гэтую тэму неаднойчы выступала з дакладамі на пасяджэннях міжнародных арганізацый.

Каміла вядомая і на радзіме як журналіст і пісьменнік. Рашуча абвяргае тэзіс аб тым, што ў Швецыі няма бізнес-вумен, якія могуць весці справы на роўных з мужчынамі. Разам з аднадумцамі склала спіс гэтых паспяховых жанчын, шмат расказвала пра іх у газетах і часопісах. Напісала кнігу ў падтрымку здольных дзелавых жанчын, рэгулярна выступала на радыё і па тэлебачанні...

Яна робіць уражанне моцнай, вельмі самастойнай і ўпэўненай у сілах жанчыны. У яе трое дзяцей, якіх яна выхоўвае адна. На хлеб сабе і дзецям зарабляе самастойна і пры гэтым паспявае займацца грамадскай работай у імя барацьбы з дыскрымінацыяй жанчын. Бо, нягледзячы на тое, што адзін з міністраў мае непасрэдны абавязак усямерна працаваць над усталяваннем гендарнай роўнасці, справа гэта вельмі марудна рухаецца наперад, лічыць Каміла. А жанчыны чакаць не жадаюць. Яны ў меру сваіх магчымасцяў шукаюць і знаходзяць шматлікія факты праяў гендарнай няроўнасці і даводзяць да ведама грамадства праз СМІ, выкарыстоўваючы і іншыя даступныя спосабы.

Каміла, напрыклад, зачытала нам спіс нетактоўных пытанняў, якія не варта задаваць бізнес-вумен, якую пасаду яна ні займала б. Сярод іх наступныя: «Як вам удаецца спалучаць бізнес і клопаты аб сям'і?», «Як ставіцца ваш муж да таго, што вы так шмат працуеце?», «Як пры вялікай занятасці вам удаецца выдатна выглядаць і захоўваць фізічную форму?» На думку Камілы, дзелавыя жанчыны не хочуць адказваць на такія пытанні, бо яны парушаюць гендарную роўнасць. Яшчэ Камілу і яе паплечніц непакоіць лёс выбітных жанчын, якія скончылі палітычную ці адміністрацыйную кар'еру і зараз засталіся без удзелу ў якіх-небудзь значных справах. Не ўсе з іх без псіхалагічных страт пераносяць бяздзейнасць.

Увогуле Камілу, як нам здалося, раздражняе сусветнае прызнанне Швецыі як краіны з лепшай на планеце гендарнай сітуацыяй. «Можа, так і было некалі, але толькі не цяпер», — кажа яна. І спасылаецца на вынікі аднаго даследавання, згодна з якімі, яе краіна зараз займае ўсяго толькі чацвёртае месца пасля Ісландыі, Фінляндыі і Нарвегіі. Змагаркі за раўнапраўе падлічылі, што пры быццам бы аднолькавым працоўным часе жанчыны штогод працуюць на 7 тыдняў больш за мужчын: кухня, дом, клопат аб дзецях і г.д. Няроўнасць пайсюдна! Скажам, і ў тым, што ў гісторыі Швецыі ніколі не было жанчыны прэм'ер-міністра, на вядучых пазіцыях ва ўладзе, у вялікіх кампаніях знаходзяцца па-ранейшаму мужчыны. І зусім мала жанчын — кіраўнікоў прадпрыемстваў. Гэта таксама несправядліва.

ПРЫКЛАДНА 17 жанчын у Швецыі штогод гінуць у выніку насілля. Гэтай агіднай з'яве шведкі поўныя рашучасці супрацьстаяць па ўсіх кірунках.

У рэдакцыі буйнейшай і ўплывовай стакгольмскай газеты «Aftonbladet», заснаванай яшчэ ў 1830 годзе, мы сустрэліся з Кэрсцін Вейгель. Гэтая журналістка — адна з аўтараў і выканаўцаў праекта «Прычына смерці — жанчына», прысвечанага барацьбе з насіллем над жанчынай. Гэты праект набыў сусветную вядомасць і варты таго, каб пра яго расказаць асобна.

Супрацоўнікі рэдакцыі вывучылі ўсе выпадкі забойстваў жанчын у сям'і, пачынаючы з 2000 года. У газеце друкаваліся гісторыі загінулых жанчын, інтэрв'ю з іх сваякамі, сяброўкамі, суседзямі. Гэтыя публікацыі выклікалі вялікі рэзананс у грамадстве. Улады былі вымушаны рэагаваць: яны ўнеслі змены ў заканадаўства, паліцыя і сацыяльныя службы сталі больш пільна падыходзіць да разгляду выпадкаў хатняга насілля. Паступова праект выйшаў за межы краіны. Кэрсцін Вейгель разам з калегамі тры гады займалася маніторынгам выпадкаў смерці жанчын у выніку гвалту ў Пакістане, Егіпце, Мексіцы, Паўднёвай Афрыцы, ЗША, Іспаніі, Бразіліі, Расіі і іншых. Там жа журналісткі дзяліліся сваім досведам расследавання забойстваў жанчын ужо ў рамках міжнароднага праекта «Прычына смерці — жанчына».

Што датычыць нашай дэлегацыі — выкладчыкаў Інстытута журналістыкі БДУ, — то калег вельмі ўразіў сістэмны і сур'ёзны падыход, з якімі паставіліся ў Швецыі да такой праблемы, як хатняе насілле над жанчынай. Здольнасць сацыяльна актыўных шведак аб'ядноўваць свае намаганні, абмяркоўваць шляхі вырашэння злабадзённых праблем у СМІ, пераводзіць вострую размову ў палітычную і грамадскую плоскасці, прыцягваць да дыскусіі вядомых экспертаў, грамадскіх дзеячаў і парламентарыяў літаральна ўражвае...

**Леанід ЛАХМАНЕНКА,**
**старшы выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Мінск—Стакгольм*

■ Шэршэ ля фам?

# КРЫХА ДА КРЫХІ



**► Днямі скандал у грамадстве справакавала выступленне прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана, які абвясціў, што жанчына не можа быць роўнай мужчыну: «Гэта супярэчыць прыродзе, бо ў іх розныя рысы характару, розны фізічны склад... Не існуе роўнасці паміж мужчынам і жанчынай, хутчэй, можна гаварыць пра раўназначнасць». Паводле слоў прэзідэнта, рэлігія дакладна вызначае становішча жанчыны — гэта мацярынства. Парадокс у тым, паведамляе агенцтва Reuters, што падобная кансерватыўная пазіцыя была агучана на кангрэсе ў Стамбуле, прысвечаным правам жанчын і барацьбе супраць гвалту. Цяпер выказванне кіраўніка дзяржавы многія грамадскія дзеячы трактуюць як дыскрымінацыю і прагназуюць рост насілля ў дачыненні да жанчын.**

► Праваабаронцы з Аўстраліі назвалі самую небяспечную для жанчын краіну. Ёю, паводле справаздачы міжнароднай арганізацыі Caritas Australia, стала Дэмакратычная Рэспубліка Конга, якая «абышла» Афганістан, Пакістан і Індыю. У дакуменце пад назвай «Бясстрашныя галасы», у прыватнасці, робіцца высноўа, што «быць жанчынай у ДРК нават больш небяспечна, чым салдатам». Кожную гадзіну (!) у краіне насіллю, у тым ліку згвалтаванню, падвяргаюцца 48 дзяўчат, прычым часта асобы, якія здзяйсняюць падобныя злачынствы, застаюцца беспакаранымі, а ў шэрагу выпадкаў сям'я пацярпелай нават плаціць гвалтаўніку за тое, каб ён ажаніўся з дзяўчынай.



**► Паводле даследавання Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, праведзенага ў 30 краінах, сярэдні заробак жанчыны з вышэйшай адукацыяй у развітых краінах нашмат меншы за заробак мужчыны на аналагічнай пасадзе. Так, жанчыны атрымліваюць у сярэднім 134 тысячы долараў за год, у той час як мужчыны — 186 тысяч. А па звестках Федэральнай статыстычнай службы Германіі, жанчыны ў тамтэйшых прыватных кампаніях атрымліваюць у сярэднім на чвэрць менш за мужчын.**



■ Урокі жыцця

# МАЦНЕЙ ЗА АБСТАВІНЫ

**У позірку Марыі Пятроўны Сурмы, што жыве ў Глуску, столькі цеплыні і пяшчоты, што міжволі ловіш сябе на думцы: няўжо гэта тая самая жанчына, якую 53 гады таму спасціг бядачы лёс, калі ў адзін момант яна пазбавілася кісці левай рукі?**


Фота Сяргея РУДЗІНСКАГА.

— Мне тады было ўсяго 28 гадоў, — успамінае Марыя Пятроўна. — Працавала я ў каўбасным цэху райспажыўсаюза. І так здарылася, што мая рука трапіла ў нажы мясарэзкі, на якой не было ніякіх засцерагальных канструкцый. І цяпер мяне ахоплівае жах, калі ўспомню той момант. Самае страшнае, што ўратаваць кісць не было магчымасці. Усё здарылася за нейкія пару секунд. Потым была бальніца. І прысуд: «ты — інвалід». Няшчасны выпадак паставіў мяжу ў маім жыцці: да і пасля. У мінулым засталіся гады сямейнага шчасця, а наперадзе толькі пытанне без адказу: што будзе далей? Свякроў адкрыта гаварыла, што такая калека яе сыну не патрэбна. Як маці, яна хвалявалася за сваё дзіця і не магла супакоіцца, як гэта жонка адной рукой зможа і есці зварыць, і прыбраць, і малую дагледзець (у сям'і падрастала шасцігадовая дзяўчынка. — **Аўт.**), не гаворачы ўжо пра мыццё бялізны і шыццё. Я не крыўдзілася на свякроў і вырашыла сама пагаварыць з мужам. Проста так і сказала, што не трымаю яго і не пакрыўджуся, калі ён мяне пакіне. На што мой Іван коратка адказаў: «Каб я больш не чуў такіх размоў». На тым тэма нашага магчымага расставання была закрыта.

Наперадзе Марыю чакала новае жыццё. Цяпер яна, інвалід другой групы, усе свае сілы, усю энергію павінна была аддаваць сям'і. Паступова прызвычаілася рабіць усё, нават гаспадарку даглядала. Магла і свінней пакарміць, і казу падаіць. Успомніла маладая гаспадыня і пра свае любімыя заняткі — вышыванне і вязанне кручком і вышывала, што ў яе абавязкова ўсё атрымаецца.

— Я не хацела адчуваць сябе інвалідам, — працягвае Марыя Пятроўна. — Што гэта за жыццё, калі цябе шкадуюць, лішні раз аберагаюць ад клопатаў? Хацелася, каб блізкія людзі бачылі ўва мне моцную асобу. Як я радавалася ў душы і ганарылася, калі ў мяне ўсё атрымлівалася.

Прайшлі гады. Вырасла дачка Валянціна, выгадаваліся трое унукаў, падрастае пяцёра праўнукаў. Насуперак усім выпрабаванням, якія выпалі на іх лёс, з Марыяй Пятроўнай вось ужо больш 60 гадоў побач ідзе верны спадарожнік па жыцці, муж Іван Фёдаравіч. І падчас нашага прыезду гаспадыня гасцінна запрасіла нас у хату і найперш, як клапатлівая жонка, стала расказваць пра мужа: як ён усё жыццё адпрацаваў у сістэме райспажыўсаюза, паказала яго асабістую справу, шматлікія граматы і падзякі за работу. Было відаць, што яна шчыра радуецца за свайго мужа, ганарыцца яго працоўнымі заслугамі. Не выключана, што дзесьці там, у глыбіні яе душы, жыве патаемная думка, што і яна вось так магла б атрымліваць граматы і падзякі. Калі б не выпадак...

— Увесь час, пакуль мой Іван працаваў, разам з ім пражывала кожны яго дзень і я. Ён — гэта я. Таму тое, што ён заслужыў, — наша агульная радасць.

Дарэчы, слова «радасць» з вуснаў гэтай чуллівай, разважлівай жанчыны падчас размовы гучала не раз. Яна радуецца, што мае такую дружную сям'ю, што яшчэ можа штосьці зрабіць для сваіх блізкіх. І наогул радуецца, што проста жыве на свеце. Абаяльная, велікадушная, ветлівая, добрасардэчная, клапатлівая — станоўчыя эпітэты пра Марыю Пятроўну можна пісаць бясконца. Такой яна паказалася падчас знаёмства, так пра яе гавораць у сям'і. Яе шануюць усе — дзеці, унукі, праўнукі. Чаму сказала «дзеці» ў множным ліку, калі мае толькі адну дачку? Бо для яе і зяць — родны сын. Менавіта ён ва ўсіх самых лепшых фарбах расказаў пра сваю цешчу. Значыць, паважае і любіць.

— Дзеці на мяне іншы раз сварацца, каб нічога не рабіла, — заўважае Марыя Пятроўна. — А як яно без работы — зусім, як кажуць, заржавееш. Пакуль рухаешся — значыць, жывеш. Я вось хоць і не магу хадзіць, з табурэткай перамяшчаюся па хаце і па двары, усё роўна, калі дзеці не бачаць, стараюся заглянуць у агарод, каб прапалоць градкі. Я ж не калека нейкая. Не забываю і свой любімы занятак для душы. Цяжка падлічыць, колькі ўсяго вышыла і звязала. Адных толькі вялікіх абрусаў восем штук, а невялікіх сурвэтак — незлічонае мноства. Большасць падарыла дзецям і ўнукам, нешта пакінула і сабе.

**Што гэта за жыццё, калі цябе шкадуюць, лішні раз аберагаюць ад клопатаў? Хацелася, каб блізкія людзі бачылі ўва мне моцную асобу.**

Напрыканцы мы папрасілі Марыю Пятроўну паказаць, як яна вяжа. «Дзед, дзе мая трэцяя рука? — усміхаючыся, спытала жанчына. — А вось яна, знайшлася, зараз павяжу». Праз хвіліну кукса была ўжо моцна абматана шырокай прагумаванай тасёмкай, у якую быў устаўлены вязальны кручок. Трэба было бачыць, як па-майстэрску запрацавалі яе рукі і літаральна на вачах вырас ланцужок будучай сурвэткі...

**Вольга ЧУЧВАЛ**

■ Разумныя рэчы

# ДЫХАЕМ ЛЯГЧЭЙ

**Пра ўвільгатняльнікі паветра ўспамінаюць бліжэй да зімы, калі ў памяшканні становіцца суха з-за вымарожвання вадзяных пароў і ўключэння ацяплення. Гэта прыводзіць да высыхання скуры і непрыемнага перасыхання слізістых носа і горла (адкуль прамая дарога для рэспіраторных і інфекцыйных захворванняў), а таксама перашкаджае самаачышчэнню бронхаў. Аптымальны для чалавека паказчык адноснай вільготнасці паветра складае 50—60%, а ва ўмовах нашага кантынентальнага клімату зімой ён падае да 20%. Вось таму і ўзнікае неабходнасць ва ўвільгатненні паветра ў кватэры з дапамогай вышэйзгаданых прыбораў. Сёння на рынку бытавыя ўвільгатняльнікі прадстаўлены трыма відамі: традыцыйны, паравы, ультрагукавы.**

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ (КЛАСІЧНЫЯ)



У прыборах гэтага тыпу вентылятар праганяе паветра праз вільготны фільтр (увільгатняе картрыдж) або праз пласціны барабана, якія пастаянна змочваюцца, у выніку чаго паветра нязначна астывае і ўвільгатняецца. Класічныя ўвільгатняльнікі **адрозніваюцца эканамічным спажываннем электраэнергіі, прастатой у эксплуатацыі і нізкім узроўнем шуму.** У ідэале яны павінны працаваць на **дыстыляванай вадзе**, інакш картрыдж будзе хутка забруджвацца і яго прыйдзецца часта мяняць. Некаторыя мадэлі маюць антыбактэрыяльную касету, дзякуючы якой знішчаюцца патагенныя мікраарганізмы. Многія традыцыйныя ўвільгатняльнікі можна **выкарыстоўваць і для араматэрапіі:** для гэтага трэба ўсталяваць капсулу, якая змяшчае араматычнае рэчыва. Дзякуючы абсалютнай бяспецы эксплуатацыі іх рэкамендавана выкарыстоўваць у дзіцячых пакоях і спальнях. Недахопам з'яўляецца абмежаванне вільготнасці (не больш за 60%). Калі ж вы хочаце павялічыць прадукцыйнасць прыбора, рэкамендавана паставіць яго **паблізу ад крыніцы цяпла** або ў месцы найбольшай цыркуляцыі паветра — інтэнсіўнасць выпарэння пры гэтым узрасце.

## ПАРАВЫЯ



Працуюць па прынцыпе "гарачага" выпарэння, калі нагрэтая вадаператвараецца ў пар. Характэрнымі асаблівасцямі з'яўляюцца магчымасць павелічэння вільготнасці больш за 60% і самая вялікая, у параўнанні з іншымі ўвільгатняльнікамі, прадукцыйнасць — выпарэнне **да 700 грамаў вадкасці ў гадзіну.** Важным момантам з'яўляецца і лёгкасць у абслугоўванні: для яго **не трэба ніякіх расходных матэрыялаў** накшталт картрыджаў і фільтраў. Бяспека эксплуатацыі закладзена ў самой канструкцыі ўвільгатняльніка. Пры поўным выпарэнні вады прыбор аўтаматычна адключаецца. Падключыць шнур электрасілкавання можна толькі да прыбора ў сабраным стане. Паравы ўвільгатняльнік вы таксама можаце выкарыстоўваць **для араматэрапіі і інгаляцый.**



Галоўная небяспека, звязаная з такімі ўвільгатняльнікамі, — **гарачая пара**, якой лёгка апячыся. Таму ўсталёўваць прыбор на падлогу або ў месцы, даступныя дзецям і жывёлам, не рэкамендуецца. Таксама прыбор такога тыпу пераўвільгатняе памяшканне, калі не прымяняюцца прылады кантролю — **гігрометр (прыбор для вымярэння вільготнасці паветра) або гіграстат (рэгулятар вільготнасці паветра).** Такія прыборы яшчэ часам даволі не маленькія. З мінусаў яшчэ і тое, што гэтыя ўвільгатняльнікі спажываюць шмат энергіі.

## УЛЬТРАГУКАВЫЯ



У іх вада, трапляючы на пласціну, якая вібрыруе з высокай частатой, расшчапляецца і выкідваецца ў выглядзе аблокаў халоднай пары. Такой парай **нельга апячыся**, таму ультрагукавы ўвільгатняльнік можна выкарыстоўваць у дзіцячых пакоях. Таксама яны вельмі **эканамічныя** і меншыя па памерах, у адрозненне ад паравых. Пры заканчэнні вады ў бачку ўвільгатняльнік аўтаматычна адключыцца. Адзіным, але галоўным, недахопам гэтых увільгатняльнікаў можна лічыць стварэнне **белага вапнавага налёту** на мэблі або іншых гладкіх паверхнях. Гэта звязана з тым, што пры працы ўвільгатняльнікаў першых двух тыпаў усе солі, якія змяшчаюцца ў вадзе, застаюцца на сценках бака для вады (як у звычайным чайніку, дзе накіп асядае на награвальным элеменце і сценках). Ва ультрагукавым прыборы мікрачасцінкі вады, асядаючы на мэблю і высыхаючы, пакідаюць пасля сябе адклады соляў, якія мы і бачым. Інтэнсіўнасць і колькасць такіх адкладаў залежыць у першую чаргу ад якасці і жорсткасці вады. Каб пазбегнуць налёту, вельмі пажадана **выкарыстоўваць дыстыляваную ваду** ці хаця б прапускаць яе праз ачышчальны фільтр (што не заўсёды дапамагае). Каб змагацца з гэтым, большасць вытворцаў выпускае картрыджы з адмысловымі напаўняльнікамі, якія змякчаюць жорсткасць вады. Сярэдні тэрмін службы такога картрыджа — ад 1 да 3 месяцаў, у залежнасці зноў жа ад якасці вады.



### Аптымальная адносная вільготнасць (pH)

- ❍ *Для чалавека — 40—60%*
- ❍ *Для аргтэхнікі і тэлекамунікацыйнай апаратуры — 45—60%*
- ❍ *Для раслін у зімовых садках, аранжарэях і цяпліцах — 55—75%*
- ❍ *Для мэблі, паркету і музычных інструментаў — 40—60%*
- ❍ *Для кніг у бібліятэках, мастацкіх музеях і галерэях — 40—60%*

### Да ведама

**Глабальны недахоп УСІХ увільгатняльнікаў паветра, пра які свядома ці часта з-за няведання маўчаць прадаўцы, — на практыцы яны <u>эфектыўна ўвільгатняюць паветра ў радыусе 1—1,5 метра</u> вакол сябе, а ў далёкіх кутках пакоя ўзровень вільготнасці прыкметна ніжэйшы. Прычыны простыя. Па-першае, убудаваны гіграстат мерае ўзровень вільготнасці вакол прыбора. Па-другое, у пакоі няма ветру, таму паветра змешваецца ў асноўным шляхам натуральнай канвекцыі (цёплае — уверх, халоднае — уніз), а вось змешвання па гарызанталі без вентыляцыі амаль не адбываецца. Таму ўвільгатняльнік <u>пажадана ставіць каля месца адпачынку</u>, хоць не ўсім падабаецца, калі яны булькаюць. Можна таксама над ім паставіць буйны вентылятар, які будзе эфектыўна разганяць вільготнае паветра па ўсім пакоі. А гэта плюс яшчэ адзін прыбор, які займае месца і спажывае энергію. А просты і галоўны спосаб — <u>зачыняць дзверы ў пакой</u>, у якім працуе прыбор. Тады ён праз некалькі гадзін напоўніцца вільгаццю па максімуме.**

### Парады па куплі і выкарыстанні

❍ ***Аддавайце перавагу прыборам з убудаваным гіграстатам або гігрометрам, каб кантраляваць узровень вільготнасці.***

❍ ***Выбраўшы ўвільгатняльнік пэўнай мадэлі, пацікаўцеся коштам расходных матэрыялаў да яго (калі яны патрэбныя) і наяўнасцю іх у продажы.***

❍ ***Варта звярнуць увагу на плошчу памяшкання, на якую разлічана дзеянне прыбора. Часам у інструкцыі ўказваецца не плошча, а аб'ём памяшкання.***

❍ ***Вялікім плюсам з'яўляецца падача сігналу або аўтаматычнае адключэнне прыбора пры недастатковым узроўні вады. Але падыдзе і бачок, праз які можна ўбачыць колькасць вады.***

■ Вам і не снілася...

# УЛЬЯНА І КАЛІНІК: ВЯСКОВЫ РАМАН

«У маім дзяцінстве — гэта 50-ыя, пачатак 60-х гадоў мінулага ўжо стагоддзя — ніякіх тэлевізараў у вясковых хатах не было, таму суседзі амаль штовечар прыходзілі адзін да аднаго ў госці, на «вячоркі», — узгадвае наша даўняя падпісчыца, чытачка і сяброўка **Соф'я КУСЯНКОВА з в. Лучын Рагачоўскага раёна.** — Размовы вяліся розныя, збольшага — успаміналі пра мінулае, пра сваіх бацькоў і вайну, пра немцаў і бежанцаў, пра пасляваеннае жыццё і палітыку, пра Берыю і Цанаву...

Як на цяперашні розум, трэба было запісваць кожнае слова з тых «вячорак»! Зрэшты, некаторыя з пачутых расповедаў затрымаліся ў памяці надоўга. Напрыклад, гісторыя кахання маіх бабулі і дзядулі па мацярынскай лініі, Ульяны Рыгораўны і Калініка Андрэевіча, мне запомнілася надзвычай добра — мабыць, таму, што падавалася надзвычайнай і прыгожай, як у раманах з таго далёкага часу.

Пачну, як пачынаюцца казкі. Жылі-былі Калінік і Ульяна. Ён быў на колькі гадоў старэйшы, таму, як ён жаніўся, яе яшчэ толькі «ў дзеўкі» прынялі. (Існаваў тады такі абрад — калі дзяўчынцы спаўняецца 14 гадоў, старэйшыя прымаюць яе ў свой гурт, «у дзеўкі»). А потым, у самым пачатку 1900-х гадоў, і яе замуж аддалі, не пытаючыся згоды, — бо ў воласць, бо за багатага. Якраз як у раманах, дзе, паводле жанру, дзяўчына — прыгажуня, а той багаты жаніх — і брыдкі, і дурны.

У бабулі так яно і было. Ужо на вяселлі жаніх паказаў свой нораў. Далей — болей: абражаў, біў, раўнаваў — да ўсіх і ўсяго... Надышоў Вялікдзень, і пайшла Ульяна на ўсяночную — асвяціць ежу ды сустрэць свята. А прыйшла ўранні — сярод двара стаіць калодка з сякерай, а вакол толькі кавалкі ад усёй яе апраткі. Усё пасек. Маўляў, ноч працягалася, дык цяпер больш нікуды не пойдзеш, каб на цябе ўсе глядзелі. Яна ўсё свята праплакала, а ён у карчме прасядзеў. Бацькі яе прыехалі — а тут на табе, свята.... Самі ўжо разумелі, якое «шчасце» дачцэ набылі. Але што ўжо зробіш? «Жыві, ты ж у царкве венчаная», — сказалі дый паехалі. Такі тады быў парадак: калі венчаная — хай хоць заб'е.

Але гэтае сямейнае жыццё было нядоўгім: неўзабаве муж памёр, а дзяцей ад яго не з'явілася. (Дарэчы, колькі жыла бабуля Ульяна, колькі ўспамінала пра тое замужжа, дык ніколі, ні разу не сказала «памёр», гаварыла — «здох»). Адпаведна, у той сям'і яна ўжо была непатрэбная і таму вярнулася да бацькоў. Але і там аказалася ўжо адрэзаным кавалкам, «наймічках» пры сем'ях братоў. Так мінуў год.

У гэты час у Калініка таксама памерла жонка Настасся — не старая яшчэ, 30 гадоў. (Жылі ж яны нядобра, увесь час сваркі ды бойкі — ён па ёй усім, што ў руках было, яна не саступала — ды па ім... А дзяцей усё роўна нажылі — чацвёра.)

Як заведзена ў вёсцы, пайшла і Ульяна на пахаванне. А насустрач ёй чужая бабулька, спыніла і кажа: «Ульяначка, не хадзі ты туды. Ты ж такая прыгожая! Як ён паглядзіць на цябе — замуж пазаве. Ты пойдзеш — ён і цябе заб'е».

Ульяна ж нічога не адказала, а сама сабе вырашыла, што горш, чым было, не будзе, і ўсё ж пайшла на пахаванне. І вось сядзяць жанчыны каля нябожчыцы, ціхенька гамоняць. На печы дзеткі спужаныя — жанчыны іх шкадуюць, бо сіроты. А бацька іх заходзіць у хату, быццам на дзяцей паглядзець, і на яе пільна пазірае, зноў заходзіць — і зноў позірк кіне, быццам дагэтуль ніколі не бачыў. Потым пры сустрэчы ў вёсцы нічога не казаў — павітаецца і глядзіць пільна...

А праз сорак дзён прыйшоў у сваты.

Бацькі Ульяны, вядома ж, былі супраць: і бедны ён, і чацвёра дзяцей. А яна сказала: «Мае татачка і мамачка, за багатага вы мяне аддалі. Дзякуй вам. Нажылася. А за гэтага сама пайду». І пайшла. І пражылі яны, як заўсёды мая мама казала, «як ціхае лета». Калінік ніколі не тое каб руку на яе падняў — нават голас не павысіў. Яна ж на яго магла і пасварыцца, і пакрычаць, а ён у адказ: «Ай, матка, не засмучайся, цішай» — і ўся сварка заканчвалася.

Нарадзілі яны яшчэ чацвёра дзяцей, у тым ліку і маю маці. Але Ульяна ніколі не падзяляла дзяцей на сваіх і не сваіх. Хіба што «не сваіх» больш шкадавала — таму магла і накрычаць на мужа, калі ёй падавалася, што ён да іх занадта строгі.

З першых дзяцей дзеда Калініка помню дзядзьку Сямёна. Ён заўсёды прыгаворваў: «Ай, ай» — і меў прыгожыя, белыя, закручаныя ўверх вусы. Яшчэ дзядзьку Яўстрата, які быў падобны тварам да Якуба Коласа. Да часу я нават не ведала, што яны родныя «напалову».

...Пайшлі з жыцця баба Ульяна і дзед Калінік у адзін год, падчас вайны. Яна не змагла перажыць, што немцы спалілі іх малодшую дачку, 17-гадовую Варачку, за сувязь з партызанамі. А Калінік пасля гэтага стаў маўклівы, зрабіўся быццам не ў сабе. І ў той жа год памёр.

Ульяне было 62 гады, яму — 67. Разам у згодзе і любові яны пражылі 36 гадоў».

# Маміна кухня


Фота pvz.by.

Тэлевядучая Ларыса ГУЛЯКЕВІЧ:

**— Для сям'і люблю гатаваць кускус, рэцэпт якога прывезла з Італіі. Гэтая страва з усходняй кухні, але яе можна гатаваць на розны манер.**

**Наконт прапорцый неабходных прадуктаў дакладна не скажу — усё на вока раблю. Крупы кускус можна набыць у супермаркеце. Пшаніца варыцца вельмі хутка, хвілін пяць, а я заварваю яе кіпенем. Паралельна тушу гародніну (гэта могуць быць памідоры, кабачкі, цыбуля — усё, што маеце пад рукой і любіце, можаце спалучаць), потым абсмажваю яе з соусам. Як толькі ўсё згатавалася, тады перамешваем гародніну з крупамі. І трымаем яшчэ адну хвіліну на агні, абсмажваючы на алеі з прыправамі. Каб быў усходні смак, я дабаўляю ка́ры. Можна ў кускус дабаўляць і крэветкі альбо шматочкі абсмажанай куркі — тут прастора для творчасці кожнай гаспадыні. А праз 15 хвілін страва гатова.**

■ Пясочніца

### НЕ МУЖЧЫНСКАЯ ЕЖА

— Мам, я хачу есці! — енчыць 4-гадовы Данік.

— Зараз, зараз, сонейка, дам табе ёгурт.

— Я не хачу ёгурт! Я есці хачу!

### ЯКІ РАСКАЗЧЫК — ТАКОЕ І ІМЯ

— Ведаеш, хто такі расказёл? — таямнічым шэптам пытаецца Юля ў мамы.

— Не, а хто гэта?

— Гэта такі чалавек, які дрэнна расказвае казкі!

### ПРАВІЛЬНЫ ДЫЯГНАЗ

— А чаму гэта дрэва ўпала? — тузае бабулю за рукаў 5-гадовая



Марынка. — Яно што, прытомнасць страціла?

### САМЫ ВАЖНЫ СКЛАДНІК

Дзімка разгадвае дзіцячую крыжаванку:

— Без яе не прыгатуеш бліны. Чатыры літары, першая «м»...

На хвілінку задумваецца, пасля чаго ўпэўнена піша: «Мама».

### НЕ ДАПАМАГЛО

— Анюта, абуй хуценька тапкі! Не хадзі басанож — ты ж кашляеш, — строга нагадвае мама.

— Дык я і ў тапках кашляю, — сумна заўважае дачка.

### ДРАПЕЖНЫЯ «БЛІНЫ»

Саша з бацькамі ўпершыню ў жыцці пабываў у акіянарыуме, дзе ўбачыў скатаў, якія плавалі ў басейне і высока выскаквалі з вады. Дзеліцца ўражаннямі з бабуляй:

— Уяўляеш, там яшчэ былі такія бліны, якія скачуць... Мы на ўсякі выпадак далей адышлі, а то, хто ведае, можа, яны яшчэ і кусачыя!

# 5 КНІГ

## для чытання разам з дзецьмі

**Ірына САВІЦКАЯ, інжынер:**

1. **Андрэй Жвалеўскі, Яўгенія Пастарнак, «Час заўжды добры».** Вы ўяўляеце, што будзе, калі дзяўчынка з 2018 года раптам трапіць у 1980-ы, а хлопчык з 1980-га перанясецца на яе месца? А вось нашы беларускія аўтары ўявілі, і ў іх атрымаўся зусім не альтэрнатыўны сцэнарый «Дзяўчынкі з будучыні», а вельмі кранальная гісторыя для дарослых і дзяцей. Асобны плюс аўтарам за тое, што расповед пра «той» і «гэты» час не проста цікавы, а пазбаўлены павучальнага тону, якім часам злоўжываюць бацькі. Вельмі добра падсунуць гэту кнігу падлеткам, якія любяць «завісаць» у сацыяльных сетках і наогул у камп'ютары. Няхай паглядзяць на сябе збоку і падзеляцца ўражаннямі.

2. **Мікалай Носаў, «Прыгоды Нязнайкі і яго сяброў».** Мне здаецца, гадоў да 10-12 абавязкова трэба прачытаць з дзецьмі хоць бы адну кнігу пра Нязнайку, бо ён — якраз увасабленне малых у гэтым узросце: гарэзлівы, непаслухмяны, часам празмерна самастойны, але яшчэ такі безабаронны і шчыры...



3. **Віктар Драгунскі, «Дзяніскавы аповеды».** Кніга, якая забаўляе, выклікае цікавасць, вучыць, што добра і што дрэнна, смяшыць — карацей, робіць усё тое, што і павінна рабіць добрая дзіцячая кніга. І не бойцеся, што змест «састарэў», праверце вопытным шляхам. Мне сёння расказы Драгунскага падаюцца ўжо не вельмі цікавымі, а вось сына-трэцякласніка было не адарваць і не спыніць рогату.

4. **Кір Булычоў, «Мільён прыгод».** Гэта класіка, праверaная часам. Кніжка пра фантастычныя прыгоды Алісы Селязнёвай і яе сяброў, напэўна, для дашкольнікаў занадта мудрагелістая. Але ўсё ж раю набыць яе на вырост: у будучыні абавязкова спатрэбіцца, асабліва калі ў вас расце маленькі «чамучка» і выдумшчык, энергію якога варта направіць у мірнае рэчышча.

5. **Серж Брусало, «Дзень сіняга сабакі».** Гісторыя пра дзяўчынку Пегі Сью, якая бачыць прывідаў, нябачных іншым. Прывіды ўсю дарогу імкнуцца нашкодзіць людзям, а гераіня — знайсці спосаб знішчыць невідзімак. Гэта кніга будзе цікавая тым падлеткам 10-13 гадоў, якія па ўзоры старэйшых цягнуцца за ўсякімі «вампірскімі сагамі», але па ўзросце яшчэ занадта малыя для іх: тут у меру страхаў, у меру прыгод, у меру гераічных учынкаў.

■ Мама, пачытай!

# ПРЫГОДЫ ЖАБКІ, РАПУШКІ І ІНШАПЛАНЕЦЯНІНА

Аднойчы Жабка і Рапушка разам глядзелі на сонца. Жабка сказала:

— Якая вялізная планета!

— Не планета, а зорка! — паправіла яе Рапушка.

— Не зорка, а планета! — запярэчыла Жабка.

— А ў кнігах жа напісана, што зорка, — сказала Рапушка.

— У кнігах усё няпраўда пра космас, — не здавалася Жабка.

— Ну добра, заўтра сустрэнемся ў мяне, — прапанавала Рапушка.

І вось надышоў ранак, Жабка прыйшла да Рапушкі а дзясятай гадзіне. Яны надумалі паляцець у космас. Зрабілі ракету, узялі з сабою ежу, ваду, балоны з кіслародам, цацкі, кніжку пра космас, апранулі скафандры.

Калі падарожнікі прыляцелі на Венеру, да іх падышоў іншапланецянін.

— Мяне клічуць Крышталік. Я хачу з вамі сябраваць, — сказаў ён.

— Добра, — пагадзіліся Жабка і Рапушка.

— Ты тут адзін жывеш? — запыталася Рапушка.

— Не, проста мае сябры і бацькі паляцелі на Нептун змагацца з нашымі ворагамі.

— Ці не хочаш ты паляцець з намі шукаць прыгод? — пацікавілася Жабка.

— А пасля далучымся да тваіх бацькоў і сяброў, — дадала Рапушка.

— Дамовіліся, — пагадзіўся іншапланецянін.

Яны пайшлі ў ракету.

— Вой, а што гэта такое мяккае? — пацікавіўся іншапланецянін, пабачыўшы мяккія цацкі.

— Гэта цацкі.

— У нас таксама ёсць цацкі, толькі цвёрдыя. Шкада, што няма такіх мяккіх.

— Не бядуй, мы табе таксама падорым, — сказала Рапушка.

— А я ведаю, што гэта, — падышоўшы да кніжкі, прамовіў іншапланецянін.

— І што? — запыталася Жабка.

— Гэта кнігі. Праўда, у нас толькі каменныя ёсць.

— Як жа вы іх можаце насіць? — здзівілася Рапушка.

— Мы робім у камяні вялізную круглую адтуліну. Тады мы бяром прыстасаванне, якое называецца лайвам. Яно таўчэ кніжку, а кніжка тым часам падае ў адтуліну. Потым, калі мы хочам пачытаць, бяром прыстасаванне — яно называецца стамілан. Да яго проста прыліпаюць гэтыя кавалачкі кніг і ўтвараецца кніжка, якую можна пачытаць, але перагарнуць на іншую старонку проста так не атрымаецца. Мы бяром прыстасаванне пад назваю ляміт, там ёсць магніцік, які мы тузаем перад кніжкаю. У нас, як вядома, няма ветру, але калі гэты магніцік тузаецца, дык кніжка гартаецца так хутка, што немагчыма заўважыць, калі не браць прыладу, якая называецца урам. Яна вельмі хутка затанатоўвае, а потым, калі нехта захоча паглядзець, ён чапляе на нос акуляры, якія ахоўваюць вочы ад моцнага напружання.

Пасля іншапланецянін запытаў:

— А што гэта ў вас за кніжкі, у якіх ляжаць кольцы Сатурна?

— Гэта не кніжкі і не кольцы Сатурна, — сказала Жабка.

— А што ж гэта?

— Гэта — кружэлка, — пачала апавядаць Рапушка. — Кружэлка, як ты бачыш, вельмі падобная да кольцаў Сатурна. Яе трэба ўстаўляць у камп'ютар.

— Няўжо існуе нешта пад гэткаю назвай: камп'ютар?

— Камп'ютар, — сказала Рапушка, — гэта прамавугольнік, але незвычайны: там можна пагуляць у нешта цікавае, занатоўваць казкі, глядзець фотаздымкі і мульцікі. Трэба проста ўставіць кружэлку.

Жабка паказала:

— Глядзі!

Яна націснула на кнопку, і раптам адтуль вылез квадрат, на якім была круглая дзірка. Жабка ўстанавіла кружэлку на круглую дзірку ізноў націснула на кнопку. І раптам іншапланецянін пабачыў на экране нейкія стварэнні, якія весела бегалі і нешта казалі.

— Хто гэта? — запытаўся тутэйшы жыхар.

— Гэта героі, — сказала Жабка. І раптам Рапушка заўважыла, што за іх ракетаю плыве вялізная рыбіна.

— Хутчэй, трэба ўцякаць! — закрычала Рапушка.

Яна адразу схапілася за штурвал ракеты, і іх вельмі моцна тузанула. І тут яны пабачылі, што гэта касмічны кіт. Ён падплыў бліжэй, іх ракета села яму на фантан, і яны ўзняліся высока-высока ў космас.

**Альжбэта МАЛІШЭЎСКАЯ-СПРЫНЧАН,**
7 гадоў

*У народзе кажуць: «СТРАЧАЛІСЯ – ЦАЛАВАЛІСЯ, А ЯК У АДНУ ХАТУ СЫШЛІСЯ – ЗА ЧУБЫ ЎЗЯЛІСЯ».*

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

■ Знаёмцеся!

# Уладзімір Мажылоўскі — новы Караткевіч?..

## Прынамсі, у беларускай гістарычнай прозе з'явілася новае імя

**З'явіўся новы аўтар, якога некаторыя смела называюць наступнікам Уладзіміра Караткевіча. Былы дырэктар невялічкай вясковай школы ў Браслаўскім раёне, Уладзімір Мажылоўскі раней пісьменніцтвам не займаўся. Аднак цяпер яго гістарычныя літаратурныя творы «выстрэльваюць» адзін за адным…**






Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Дарэчы, з Караткевічам новага пісьменніка яднае не толькі тое, што яны цёзкі, а да таго ж і землякі — абодва з Віцебскай вобласці. Асабліва цікавым падаецца той факт, што Караткевіч пайшоў з жыцця ў 54 гады, а дэбют Мажылоўскага адбыўся акурат у тыя ж 54 гады.

Кніга гэтага аўтара пад назвай «Праклён мітрапаліта Феафіла» нядаўна выйшла ў адроджанай серыі «Бібліятэка часопіса «Маладосць». Акрамя аповесці, якая дала назву кнізе, у ёй змешчаны «Друеўскі ваўкалак» і «Спіраль гісторыі». **Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Святлана ДЗЯНІСАВА** станоўча ацаніла навінку:

— Усе творы, змешчаныя ў выданні,— гэта лёгкае гістарычнае чытанне. У такім сэнсе лёгкае, наколькі лёгкім нам здаецца чытанне Уладзіміра Караткевіча. На гэта ён загадкава адказаў мне: «Ты ведаеш, у нейкім сэнсе Караткевіч прайграе нават…» Гістарычнай літаратуры сёння шмат, але часам яна занадта сур'ёзная, занадта гістарычная, «занавукоўленая»,— а тут нязмушанае чытанне.

**Такія гісторыі кахання ў нашых князёў былі, што куды да іх Рамэа і Джульеце!..**

Уладзімір Мажылоўскі на прэзентацыі сваёй кнігі, якая адбывалася ў Выдавецкім доме «Звязда», расказаў, што пісаць пачаў выпадкова. Проста ў раённых творчых конкурсах павінна была ўдзельнічаць і яго школа. Аднак на вёсцы творчыя работы замест дзяцей часта робяць настаўнікі. Вось і сталася так, што аднойчы да 945-годдзя першай згадкі Браслава ён напісаў празаічны твор на 20 старонак машынапіснага тэксту 12-м кеглем. Стварыў яго на падставе кнігі «Памяць», у якой знайшоў ліст князя Радзівіла Чорнага да мітрапаліта Кіеўскага, там жа прачытаў, што княжна Алена памерла ў Браславе. На падставе гэтага і напісаў апавяданне. Адправіў работу на конкурс пад імем вучня. Ніякага месца там не заняў. Аднак узяў і дапісаў другую частку твора і адправіў тое, што атрымалася, у часопіс «Маладосць». Там яго надрукавалі. Уладзімір Мажылоўскі расказаў таксама, што пісанне для яго — быццам нешта звышнатуральнае:

— Я не ствараю на заказ. Саджуся за стол толькі тады, калі ў мяне ў галаве нешта зрушыцца. І ў такія моманты ўжо пішу не я, а быццам нехта іншы… Часам перачытваю і здзіўляюся: «Няўжо гэта я напісаў?..» Часам натхненне быццам ідзе з неба. Гэта можа адбывацца па-рознаму: напрыклад, гляджу фільм, мяне ўразіць пэўны эпізод, і я пачынаю нешта пісаць. Пасля надрукавання ў рэспубліканскім часопісе, зразумела, з'явіўся дадатковы імпэт: я пачаў пісаць новыя аповесці.

Аўтар расказаў, што на напісанне літаратурных твораў ідзе ўвесь яго вольны час: пісаў начамі, па выхадных, на канікулах. Жонка зрэдку нават сварылася, маўляў, ні да чога іншага яму справы няма. Аднак Уладзімір кажа, што нават на працы часам думае пра тое, як і што напісаць. Здараецца, заходзіць у пэўны тупік, не ведаючы, чым усё скончыцца.

Усе творы Мажылоўскага, па яго словах, грунтуюцца на пэўных гістарычных фактах, часта ён працуе з архівамі:

— Часам, каб знайсці адно патрэбнае слова, даводзіцца перакапаць процьму літаратуры. Ад сябе я магу прыдумаць якога-небудзь селяніна, дробнага мяшчаніна — былі яны або не, хто ведае?.. Але, напрыклад, ваяводы — толькі тыя, што жылі ў сапраўднасці. Каб іх апісаць, карыстаюся летапісамі, напрыклад Баркулабаўскім. Вялікую дапамогу ў гэтым мне аказваў Браслаўскі музей, у якім я часта працаваў. Да таго ж мой сябар Канстанцін Шыдлоўскі раіў, дзе і што можна знайсці, і сам шукаў, бываючы ў Вільнюскім, Каўнаскім архівах. Часам я заказваў у яго звесткі па пэўнай тэме, і ён прывозіў мне іх. Карыстаўся таксама двухтомнай энцыклапедыяй Вялікага Княства Літоўскага, да таго ж і інтэрнэтам.

Тыя, на каго найперш разлічаныя творы былога дырэктара школы,— гэта, зразумела, дзеці і падлеткі. Сваёй творчасцю ён імкнецца паглыбіць іх веданне гісторыі і папулярызаваць яе. Да таго ж стараецца, каб гэта была не «пустая белетрыстыка, а нешта гістарычнае».

— Я хачу паказаць, што наша гісторыя нічым не горшая, чым, напрыклад, гісторыя Англіі, Францыі. Яна таксама вельмі багатая. Я не валодаю пісьменніцкім дарам, я проста рамеснік. Аднак у нашым мінулым столькі цікавага — хочацца ўсё гэта развіць. Такія гісторыі кахання ў нашых князёў былі, што куды да іх Рамэа і Джульеце!..

**Нам патрэбны такія творы, дзе на нашу гісторыю мы глядзім вачыма беларускага народа.**

Станоўча творчасць новага пісьменніка, які, нягледзячы на сталы ўзрост, толькі нядаўна з'явіўся ў друку, станоўча ацаніла і **пісьменніца, літаратурны крытык Людміла РУБЛЕЎСКАЯ:**

— Думаю, усе мы павінны ўзрадавацца, што ў нас з'явіўся такі пісьменнік. Я асабіста вельмі рада, што ў гэтую нішу, амаль не запоўненую, якую я таксама імкнуся насычаць, прыйшоў перспектыўны працаўнік, аднадумца. Беларуская гісторыя — гэта тэра інкогніта для нас. Нам здаецца, што мы нешта ведаем, бо сапраўды цікавімся, чытаем. Аднак Уладзімір Мажылоўскі, кантактуючы са школьнікамі, ведае, як усё насамрэч. Часам нават у артыкулах калег даводзіцца чытаць, што, каб не Пётр I, сядзелі б нашы продкі ў церамах, насілі б бароды. У іх няма ўсведамлення, што, калі там кіраваў Пётр I, у нас ладзіліся балі, на якіх дамы танчылі з дэкальтэ… Таму трэба казаць нават пра гістарычны лікбез. Тое, што робіць спадар Уладзімір,— гэта надзвычай карысна, гэта павінна быць папулярызавана, ацэнена. Я часта чытаю літаратурныя гістарычныя творы, што дасылаюць на розныя конкурсы. І бачу, што ёсць праблема — у іх адсутнічае беларусацэнтрычнасць. Нам жа патрэбны такія творы, як піша Мажылоўскі, дзе на нашу гісторыю мы глядзім вачыма беларускага народа.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Фестываль

# «Бярэзінская рампа» збірае таленты

**З 28 па 30 лістапада на Міншчыне пройдзе абласны фестываль народных тэатраў «Бярэзінская рампа».**

Сем аматарскіх тэатральных калектываў цэнтральнага рэгіёна (а гэта амаль паўтары сотні артыстаў) падзеляцца творчымі дасягненнямі.

Рэжысёры вобласці звяртаюцца не толькі да твораў айчынных аўтараў, але і да замежнай драматургіі, спрабуюць свае сілы і ў аўтарскай творчасці. Сёлета ў фестывальнай афішы — вершаваны «тэатральны фельетон» па творы рэжысёра Слуцкага тэатра Дзмітрыя Шуманіна, драматычная балада па паэме Міколы Арочкі «Каптур і карона». Пасля творчага перапынку зноў прыме ўдзел у «Бярэзінскай рампе» народны тэатр Вілейскага Палаца культуры з добра вядомым усім «Звычайным цудам» Яўгена Шварца. Адметна, што музыка і тэксты песень да мюзікла напісаны рэжысёрам тэатра Вадзімам Шырочыным.

На жыццёва-філасофскія тэмы разважаюць рэжысёры Мікалай Пытляк з Беразіно і Андрыян Барткевіч з Маладзечна. Падзеям перамožных дзён 1945-га прысвячае баладу «Радавыя» Аляксея Дударава Пухавіцкі народны тэатр. Аматарам рускай класікі рэжысёр Наталля Радзівонава разам з удзельнікамі жодзінскага тэатра прадставяць гогалеўскую «Жаніцьбу».

У заключэнне гледачу будзе прапанаваны спектакль па навеле Франца Кафкі «Пераўтварэнне» ў выкананні гасцей з Гродна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

ДЕЛЬТА БАНК
www.deltabank.by

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ВЫИГРАЙ МИЛЛИОН»

**1. Сведения о Рекламной игре**

Организатором Рекламной игры является Закрытое акционерное общество «Дельта Банк» (далее – Организатор), зарегистрированное 25.01.2001 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000015. Лицензия на осуществление банковской деятельности №27 от 26.04.2013 выдана Национальным банком Республики Беларусь. Местонахождение Заинтересованного лица: 220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95. УНП 807000015.

Рекламная игра носит название «Выиграй миллион» (далее – Игра) и проводится с 15 сентября 2014 года по 1 декабря 2014 года включительно (включая сроки выдачи призов и опубликования результатов проведения рекламной игры). Свидетельство о регистрации рекламной игры № 2427 от 05.09.2014 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Всего к участию в игре было допущено 14 419 участников, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры. Призовой фонд разыгран полностью.

**2. Победители Рекламной игры**

В соответствии с Правилами Игры победителями стали 300 участников, выигрыш каждого с учетом удержания подоходного налога составил 1 000 000 белорусских рублей. Победители Игры:

| Розыгрыш № 1: | Розыгрыш № 2: | Розыгрыш № 3: | Розыгрыш № 4: | Розыгрыш № 5: |
|---|---|---|---|---|
| Альхимович С.В. | Адасько А.М. | Агеенко В.С. | Баль С.К. | Антонова И.В. |
| Андрухов А.П. | Александрова Е.Н. | Боданюк С.А. | Бобровник В.В. | Атрушкевич Н.М. |
| Анистратова Н.Г. | Анцута Г.Т. | Брылева Н.И. | Боровая Л.М. | Бакланова С.Я. |
| Бабич Н.В. | Апарович А.В. | Быховцов Г.А. | Будревич Т.Д. | Барановская А.А. |
| Березовский И.Н. | Бабирад Р.А. | Васюкова В.В. | Вергейчик Г.В. | Бегун Н.А. |
| Богук Ю.А. | Баранская Н.В. | Восковцов С.А. | Высоченко Т.Э. | Белонович А.И. |
| Болдовская Т.В. | Батухтин Д.В. | Гайдуковский И.К. | Гайдукевич А.И. | Белькевич В.А. |
| Волосевич Р.В. | Белбухова Н.М. | Грамыко А.А. | Дриневская Н.В. | Богунова В.В. |
| Воронов Э.Е. | Бракалов И.В. | Демиденко М.А. | Дубровская Т.А. | Бусалова Ж.Л. |
| Градович С.М. | Венцель В.В. | Денис П.Е. | Еромчик Н.В. | Буховцов М.В. |
| Гузак И.И. | Воронько Т.В. | Жуковец Д.Г. | Есис Е.И. | Васильева Е.А. |
| Гунько С.И. | Гаврюшко Н.С. | Журавский Н.А. | Задаля В.Н. | Выростка Т.Ч. |
| Демидик Т.И. | Гарицкая Л.Н. | Захаренко Г.Н. | Ильчук Н.В. | Голубева А.В. |
| Добромыслова Л.Н. | Горохов Г.П. | Исаченко А.Э. | Кадовба А.А. | Горичева Е.М. |
| Драница И.С. | Гресько В.И. | Клевченя И.В. | Карабанов А.В. | Губко А.Г. |
| Дрозд Н.Ю. | Демидович Р.В. | Комаровская М.П. | Карлюк А.М. | Гуринович Р.А. |
| Еленёва Н.В. | Долбик Е.В. | Коржнев А.А. | Клименко Л.А. | Дегтерева Ж.Ф. |
| Жук А.В. | Дорошенко А.В. | Кошин И.С. | Коверчик С.В. | Жарина Т.М. |
| Жулаева И.М. | Дулько Л.А. | Кулага К.Ф. | Коробова Н.К. | Игнацкая Н.В. |
| Заблоцкая В.М. | Картузова Е.В. | Кулик В.Е. | Кривуля А.В. | Касьянов В.В. |
| Замараева О.Е. | Киреенко Л.А. | Купрацевич Т.В. | Левицкая Е.В. | Коляда А.А. |
| Землянский А.В. | Клепча А.В. | Лазюк Е.П. | Лещёнок А.Н. | Коржова Е.Л. |
| Зинкевич В.И. | Кобылко Н.И. | Левчук Ю.Е. | Ложко С.М. | Кривко М.Н. |
| Зубко Н.Н. | Коваленко Н.В. | Линник Л.В. | Лукьянчук А.А. | Крицкая С.В. |
| Игнатенко Л.В. | Колесникова В.М. | Маляревич А.В. | Малоушкина Н.А. | Крот А.П. |
| Игнатович Л.Д. | Колос Н.И. | Мамай А.Л. | Мисюк Л.А. | Кучерявых А.В. |
| Казарин С.Л. | Конюхова Е.В. | Мамай Н.К. | Морозова С.Л. | Левдорович И.А. |
| Касперович И.В. | Кукушкина О.Е. | Маринич И.Н. | Назаренко В.М. | Лизук А.Н. |
| Кецко М.Н. | Лабузнов С.Г. | Маршенюк Н.В. | Нахимова С.Н. | Литвинцева В.В. |
| Климушко О.И. | Лебедко А.О. | Михаленя А.Н. | Нестерович Ю.Н. | Лозко Т.П. |
| Козел О.В. | Левкова Л.М. | Могильницкий С.В. | Никитина Ю.В. | Лукашевич А.В. |
| Козлова Н.В. | Лешик З.И. | Морозова О.В. | Пашко С.В. | Лымарь Н.И. |
| Кузнецова О.А. | Макареня Т.И. | Морозова О.Е. | Прищик И.В. | Ляховец Т.В. |
| Куис А.К. | Маркевич Т.С. | Назаревич Т.М. | Пужевич С.А. | Макарова Г.А. |
| Кунгер Л.Г. | Матюшевская Т.А. | Олехнович В.М. | Ровбуть Е.И. | Меньшакова Е.В. |
| Купринчик Т.П. | Мелешко Я.Е. | Пархоменко Е.Н. | Романовская Я.И. | Михолап И.В. |
| Курочкина А.В. | Мешков В.Н. | Прохорова Н.В. | Романчак В.М. | Новикова Т.А. |
| Кутовский А.С. | Минько П.В. | Прусаков Т.М. | Рубин Е.А. | Папкова Т.П. |
| Ланцевич С.Н. | Морозов А.М. | Пундик Л.А. | Рубис Я.Г. | Петух А.А. |
| Линчук В.С. | Носков Р.С. | Радченко А.Н. | Рысев В.И. | Русанова Т.М. |
| Матвейчик Н.Н. | Образов И.П. | Ремитенок Н.В. | Савченко Г.В. | Рутковская Е.В. |
| Михалкова З.И. | Орлова Л.И. | Рубан В.С. | Садовская И.З. | Савченко В.Р. |
| Муравей И.М. | Поплевко Е.В. | Рутковский С.С. | Свиридова Е.Н. | Самусик М.Ф. |
| Мурашкевич Т.Г. | Райко И.В. | Сачковская М.П. | Степанович Н.А. | Светоносова Т.И. |
| Прихошко А.С. | Силицкая Е.Л. | Середа С.В. | Сухоцкая Т.И. | Семенова Л.А. |
| Пушкова Е.В. | Снежко Л.Я. | Синило Н.В. | Тетерина Т.Н. | Симкина Н.Ф. |
| Романович Н.Н. | Сорокопыт В.И. | Спичёнок И.К. | Усова Л.В. | Симончик Т.А. |
| Рыбак Е.А. | Сподобаева А.А. | Сташук С.С. | Усова Р.И. | Снитко С.К. |
| Сосновская С.Л. | Типунов С.Т. | Сыродой Д.С. | Федорук О.А. | Сонич В.Н. |
| Сочнев А.В. | Томчук Т.А. | Терещенко А.П. | Филипенко А.В. | Стреленко В.В. |
| Стариков Б.А. | Тюрин Ю.В. | Трошко Т.П. | Филипенко А.Н. | Танкович Н.Г. |
| Столбунова И.И. | Фильманович Н.К. | Фомин Л.С. | Целюк Т.И. | Терещенко И.И. |
| Тайлакова Н.Н. | Харчиков Д.В. | Хлыстун А.Ю. | Черкас Л.В. | Тимощенко А.В. |
| Хоружонок С.М. | Ченцов Д.В. | Ходотович А.Я. | Чугулькова А.В. | Фомин В.Д. |
| Циунчик Д.А. | Шарпаева Е.П. | Цапанд Д.Э. | Шедов А.С. | Цуран Н.Н. |
| Чепуров В.Н. | Шнитко Л.И. | Черных С.В. | Шелюто А.Н. | Чёрный В.В. |
| Чернушина О.Д. | Шумилова С.Л. | Шевлюков Б.М. | Шлеменкова Н.Я. | Шевель Ю.М. |
| Чувальский В.В. | Юрковец Д.В. | Шпуталов С.Г. | Шульга С.Н. | Штукарь И.А. |
| Шурова Л.Н. | Якута Л.М. | Ясюк С.М. | Язенок С.Н. | Шумская Н.Н. |
| Юранов К.Н. | Ярош П.Н. | Ясюченя К.А. | Яцкевич В.А. | Ющик Л.К. |

**Телефоны горячей линии Игры для справок: + 375 (17) 279 0 279 ежедневно с 08.00 до 21.00, адрес электронной почты: info@deltabank.by.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО НА ПРАВЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ДЯТЛОВСКАЯ СЕЛЬХОЗТЕХНИКА»

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Лот №1** | | | | |
| **Наименование предмета торгов, краткая характеристика** | **Капитальное строение с инв. № 451/С-1986 –** склад запчастей, одноэтажное, кирпичное, общ. площадью 567$м^2$, 1985 г.п., **капитальное строение с инв. № 451/С-1990** в составе: котельная с дымовой трубой общ. площадью 203,9 $м^2$, 1969 г.п.; покрытие асфальтобетонное площадью 7 442 $м^2$, забор металлический площадью 179 $м^2$; уборная из ж/б панелей. | | | | |
| **Местонахождение имущества** | Гродненская обл., г. Дятлово, ул. Советская, 106 б | | | | |
| **Информация о земельном участке** | Имущество расположено на земельном участке площадью 1,8768 га с кадастровым номером 422350100002001055, назначение – для обслуживания зданий и сооружений | | | | |
| **Начальная цена предмета торгов** | 558 029 340 рублей с учетом НДС | **Сумма задатка** | 55 802 934 рубля | **Условия торгов** | Без условий |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Дятловская сельхозтехника», Гродненская обл., Дятловский р-н, д. Мировщина, ул. Лесная, 10, тел. 8 (01563)34700 | | | | |
| **Сведение об организаторе торгов** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: 8 (0152) 77 23 79, 74 49 11 | | | | |
| **Номер счета организатора торгов для перечисления задатка** | р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяется по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи | | |
| **Торги состоятся 8 декабря 2014 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | **по 2 декабря 2014 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | | | |
| Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: (0152) 77 23 79, 74 49 11 | Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» № 190 от 07.10.2014 года, № 213 от 11.11.2014 года | | | | |

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторных аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке** | | |
| | **лот № 1** | **лот № 2*** | **лот № 3** |
| **Предмет аукциона** | в квартале, ограниченном ул. Советских Пограничников, 4, 6/1, 8 и ул. 17 Сентября, 3, 5, 13 и ул. Буденного, площадью 0,6079 га | по ул. Карла Маркса, 90, 92 и 94, площадью 0,1671 га | на пересечении ул. Менжинского, 3 и ул. Салтыкова Щедрина, площадью 0,4703 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | строительство группы жилых домов с объектами торговли и услуг и (или) административно-офисного назначения | строительство объекта общественного питания и торговли | строительство объекта торгово-административного назначения |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **в аренду сроком 5 лет** | **в аренду сроком 5 лет** | **в аренду сроком 5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | здания и сооружения РСУП «Брестплемпредприятие», КУПП «Брестское котельное хозяйство», КУП «ЖРЭУ г. Бреста», ООО «Брестский городской центр научно-технического творчества молодежи», а также изолированные помещения и сараи, *находящиеся в собственности граждан* | жилые дома граждан по ул. Карла Маркса, 92 и 94 | жилой дом граждан по ул. Менжинского, 3 |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой** | | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **769 877 479** | **252 664 107** | **640 516 590** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 153 975 000 | 50 530 000 | 128 100 000 |
| **Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, тех.условий, АПЗ (руб.)** | 49 585 734 | 24 018 128 | 10 943 936 |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям, (руб.)** | **3 363 172 181** *(на 11.06.2014 г.)* | **1 492 139 000** *(на 27.05.2014 г.)* Сумма фактического размера убытков будет рассчитываться на этапе отвода земельного участка, при этом дом по ул. Карла Маркса, 90 после отселения будет переведен в состав нежилого фонда и оценен по рыночной стоимости | **512 550 000** *(на 28.06.2014 г.)* |

*** дополнительное условие продажи по лоту № 2 –** при изъятии земельного участка по ул. Карла Маркса, 92 в г. Бресте возмещение убытков землепользователю в виде предоставления в собственность квартиры типовых потребительских качеств из расчета не менее 15 кв. метров на собственника и на каждого члена его семьи, зарегистрированного по месту жительства.

**Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Условия продажи:**
Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона, в аренду сроком на 5 лет для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду, при соблюдении следующих условий:
- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий двух лет, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
- в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов) и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта;
- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан приступить к освоению (занятию) земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство объекта).

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

